№ 6 (556) 14 лютага 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# У ценю крамлёўскіх зорак

Палітыка ЭС у дачыненьні да Беларусі ня толькі не забясьпечвае выкананьне заяўленых ёй мэтаў, але фактычна заахвочвае беларускія ўлады да правядзеньня новых рэпрэсій. Пішуць Дзяніс Мельянцоў і Віталь Сіліцкі. Старонка 4.

## У НУМАРЫ

**Ракіроўка па-беларуску**

Пятра Міклашэвіча замянілі з Рыгорам Васілевічам. **Старонка 3.**

**Шура-бура вакол нафты і Ломацця**

Аляксандар Лукашэнка падтрымаў прапанову Камітэту дзяржкантролю аб стварэньні рабочай групы па комплекснай праверцы рэалізацыі нафтапрадуктаў. **Старонка 8.**

**Новая газавая вайна**

Украінска-расейскі канфлікт скончыўся перамогай Юліі Цімашэнкі — адмовай ад пасярэднікаў у пастаўках газу. **Старонка 6.**




**Заля не зьмясьціла ўсіх ахвотных трапіць на прэзэнтацыю кнігі Андрэя Хадановіча «Бэрлібры». Старонка 16.**

# Нашаніўцы ў Менску і Горадні

**21 лютага ў Менску на Ўправе БНФ (вул.Варвашэні, 8)** пройдзе прэзэнтацыя кнігі Евы Вежнавец «Шлях дробнай сволачы». Чакаецца ўдзел Касі Камоцкай.**Пачатак а 18-й.**

**29 лютага ў 18.30 у Горадні на сядзібе ТБШ (вул.-Будзённага, 48а)** — вечарына дзіцячай кнігі. Удзельнічаюць перакладчык кніжкі А.Мілна «Віня-Пых і ўсе-ўсе-ўсе» Віталь Воранаў і рэдактар перакладу кнігі А.Ліндгрэн «Карлсан-з-даху» Лявон Баршчэўскі. На вечарыне таксама можна будзе пазнаёміцца са сьвежымі выданьнямі ARCHE і «Кнігарні «НН».



**Стомлены амэрыканскі салдат у Іраку. Гэты здымак міжнародная агенцыя World Press Photo прызнала найлепшым за 2007 год.**

# Прапанова: Агульнанацыянальная дыктоўка як сьвяткаваньне 90-годзьдзя БНР

Некалькі дзён таму меў размову з вэтэранам нацыянальнага руху, якому ўжо 75 гадоў. Шмат пра што пагаманілі, а калі згадалі шэсьце на 90-годзьдзе БНР, ён сумна зазначыў: «Гады ня тыя, каб хадзіць. Ногі баляць, ледзь да крамы даходжу...» Сьвята для такога чалавека можа і ня ўдацца. Бадай што каля радыёпрымача.

Пасьля той размовы даведаўся, што літоўцы ў трэці раз 26 студзеня правялі па ўсім сьвеце агульнанацыянальную дыктоўку. Прычым шмат каму зь беларусаў знаёмы міністар замежных справаў Літвы Пятрас Вайтэкунас пісаў яе ў Нямеччыне разам з кіраўнікамі літоўскіх грамадаў краінаў ЭС. Пісалі і беларускія літоўцы ў пасольстве Літвы ў Менску... Пісалі, каб мацаваць павагу да роднай мовы, каб яна разьвівалася. І гэта была грамадзкая акцыя эўрапейскай краіны, дзе дзяржаўнасьць мовы гарантуе яе неўміручасьць. Дарэчы, пераможцы конкурсу дыктовак робяцца мэдыйнымі героямі Літвы.

Я падумаў, а чаму б і нам, беларусам, перад 25 Сакавіка не напісаць разам агульнанацыянальную дыктоўку? Уявіце, як а вызначанай гадзіне скрозь, дзе толькі мажліва: у офісах партыяў, у Таварыствах беларускай мовы, у школах і рэдакцыях — селі грамадзкія лідэры разам з шараговымі сябрамі руху і партыяў. Выбітныя пісьменьнікі, гісторыкі, навукоўцы селі поруч са сваімі чытачамі і разам напісалі сваю дыктоўку на тэму «Чаму і як я сьвяткую 90-годзьдзе БНР». Дыктуе аўтар тэксту, праз радыё «Свабода», а таксама з аўдыёзапісаў. А пасьля, на мітынгу, удзельнікам раздаецца правільны тэкст. Камісія абвяшчае пераможцаў. Поўныя тэксты друкуюцца ў «Народнай волі», «Нашай Ніве»...

Сама акцыя сумеснага напісаньня дыктоўкі ва ўсіх куточках Беларусі і за яе межамі можа стаць усясьветнай дэманстрацыяй салідарнасьці беларусаў з роднай мовай.

Кожны зможа забраць дыктоўку ў свой уласны архіў, праверыць сам сябе па матрыцы і потым паказваць дзецям і ўнукам тэкст першай агульнанацыянальнай дыктоўкі.

Хто напіша тэкст дыктоўкі? Нашы пісьменьнікі здольныя.

Чым узнагародзіць пераможцаў? Напрыклад, падарыць пераможцу копію «Звону Волі». Марачкін ужо падтрымаў гэтую ідэю. Цяпер зьвяртаюся да тых людзей, што лічаць сябе паліттэхнолягамі ці робяцца такімі напярэдадні акцыі і пакутуюць, вынаходзячы так званыя мабілізацыйныя мэтады.

Асобная тэма — звароты да ўладатрымальнікаў з прапановамі ўзяць удзел у агульнанацыянальнай дыктоўцы. Год таму нельга было прадбачыць, што яны з 25 Сакавіка будуць гнаць хвалю акцыяў пад лёзунгам «За незалежную Беларусь». Гэта вынік нашай настойлівай працы. Наўрад ці ўлады далучацца да дыктоўкі апазыцыі. Але зь цягам часу хай самі ладзяць нешта падобнае. Калі беларусы па ўсім сьвеце будуць пісаць у адзін дзень, дэманструючы шанаваньне роднай мовы, то ніякая прапаганда ня зможа збэсьціць салідарнасьць з культурай, з традыцыяй.

У тэхналягічных момантах маёй прапановы шмат што трэба ўзгадняць, але трэба і рабіць, нават калі першы раз нешта і ня ўдасца ідэальна.

Дарэчы, ведаю, што беларусы сьвету гатовыя дапамагчы з памяшканьнямі для напісаньня такой дыктоўкі нашым землякам за мяжою.

90-годзьдзе БНР дае вельмі добрую нагоду распачаць новую традыцыю. І тады мой знаёмы, якому ўжо 75 гадоў, а таксама малыя, якіх бацькі палохаюцца выводзіць на вуліцы, змогуць узяць свой удзел у дэманстрацыі за партай у гонар слыннай даты. І будучы змагар за Незалежнасьць будзе помніць, як пісаў дыктоўку разам зь беларусамі ўсяго сьвету, тым самым бароначы мову і волю, і сваю будучыню.

**Уладзімер Падгол**

# Ракіроўка па-беларуску: Пятра Міклашэвіча памянялі на Рыгора Васілевіча

У пятніцу ўвечары Аляксандар Лукашэнка нечакана зрабіў кадравую ракіроўку двух высокіх чыноўнікаў. Генэральны пракурор Пятро Міклашэвіч узначаліў Канстытуцыйны суд, а былы старшыня Канстытуцыйнага суду Рыгор Васілевіч стаў Генэральным пракурорам, паведаміла БЕЛТА. Выглядае досыць дзіўным, калі чыноўнікаў такога рангу проста мяняюць пасадамі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Пятро Міклашэвіч**

аднагодак А.Лукашэнкі, нарадзіўся ў 1954 у Касуце на Вялейшчыне. Скончыў БДУ, працаваў судзьдзём Гомельскага абласнога суда, першым намесьнікам міністра юстыцыі, першым намесьнікам старшыні Вярхоўнага суду (1999—2004). Пасаду генэральнага пракурора займаў з 29 лістапада 2004.

Нагадаем, што Рыгор Васілевіч быў вызвалены ад пасады старшыні Канстытуцыйнага суду 11 студзеня. Афіцыйная трактоўка «ў сувязі з завяршэньнем тэрміну паўнамоцтваў і выхадам у адстаўку». Некаторыя аналітыкі меркавалі, што месца Васілевіча магла заняць намесьніца кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Натальля Пяткевіч. Сам Васілевіч пасьля адстаўкі адмежаваўся ад кантактаў з прэсай, рэзка адмаўляючы ў інтэрвію.

Кіраўнік краіны не рабіў ніякіх гучных заяваў адносна адстаўкі Васілевіча. Не было таксама ніякіх падставаў думаць, што былы старшыня Канстытуцыйнага суду мог трапіць у няміласьць да Лукашэнкі. Як бачым, Васілевіч проста чакаў новага прызначэньня.

Цікава, што ў той самы дзень, 8 лютага, А.Лукашэнка прыняў з дакладам Пятра Міклашэвіча. Цяпер ужо былы Генэральны пракурор праінфармаваў кіраўніка дзяржавы «пра выніку дзейнасьці пракуратуры па ўмацаваньні правапарадку і законнасьці ў 2007 годзе».

Паводле вынікаў гэтай сустрэчы зь цяжкасьцю можна было б сказаць, што ўжо праз пару гадзін Міклашэвіч перастане займаць пасаду Генпракурора. Лукашэнка паставіў перад Міклашэвічам задачу актывізаваць сёлета працу праваахоўных органаў па раскрыцьці злачыннасьці, а таксама запатрабаваў «прыняць вычарпальныя і своечасовыя захады ў павышэньні каардынуючай ролі пракуратуры і ў барацьбе са злачыннасьцю і карупцыяй». Міклашэвічу быў аддадзены яшчэ шэраг распараджэньняў, але менавіта як Генэральнаму пракурору. І вось раптам...

Варта адзначыць, што чуткі пра тое, што Пётар Міклашэвіч просіцца ў адстаўку з пасады Генпракурора, хадзілі ўжо досыць даўно. Казалі, што ў сьнежні Міклашэвіч быццам бы пісаў рапарт на імя Лукашэнкі з просьбай вызваліць з пасады. Ня выключана, што гэта магло быць зьвязана са скандалам са зьбіцьцём кадэбістамі старшыні камітэту дзяржкантролю Зянона Ломаця. Разам з тым, на апошняй сваёй прэс-канфэрэнцыі 16 студзеня Міклашэвіч, адказваючы на пытаньне пра магчымую адстаўку, рашуча сказаў: «Гэта няпраўда».



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Рыгор Васілевіч**

нарадзіўся 13 лютага 1955 у Менску, скончыў БДУ (1980), доктар юрыдычных навук (1994). Член Канстытуцыйнага суду з 1994 г. У час працы першага складу КС (1994—1996) шмат разоў выказваў нязгоду з пазыцыяй яго старшыні Валера Ціхіні. З 13 студзеня 1997 да 2008 — старшыня Канстытуцыйнага суду.

У любым выпадку, Пётра Міклашэвіч атрымаў ня «пыльную» і ціхую працу ў выглядзе старшыні Канстытуцыйнага суду. Прызначэньне ж Васілевіча можа азначаць зьмяншэньне ролі Генэральнай пракуратуры.

**Зьміцер Панкавец**

## КАМЭНТАР

## Васілевіч у ролі «добрага сьледчага»?

Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Вызначальным ёсьць іміджавы момант. І Міклашэвіч, і Васілевіч — людзі Сыстэмы. Але калі першы ў вачох Эўропы ды нашай незалежнай грамады асацыюецца з малапрывабнымі рэчамі кшталту палітычных рэпрэсіяў (за што і трапіў у сьпіс невыязных), то другі, як ні круці, — з выступам у абарону беларускай мовы ды скасаваньнем дазвольнага штампу на выезд.

Усе ведаюць клясычную гульню ў злога і добрага сьледчага. Дык мо цяперашняя ракіроўка мусіць прадэманстраваць Захаду «добрага сьледчага» на пасадзе кіраўніка Генпракуратуры — структуры непараўнальна болей важкай і ўплывовай, чым Канстытуцыйны суд?

Новаму яе начальніку фармальна можна з чыстага аркуша пачынаць і вывучэньне справаў тых самых палітвязьняў. Экс-адвакат Казуліна Ігар Рынкевіч зазначае, што «фармуляваньне Васілевічам праўнай пазыцыі ў справе А.Казуліна з вызваленьнем галоўнага палітзьняволенага стала б яркім дэбютам на новай пасадзе…». Наіўна лічыць, што нейкі чыноўнік у нас можа ладзіць самастойную гульню. Але ў кантэксьце цяперашняга «рэнэсансу» заходняга вэктару можна чакаць нейкіх новых крокаў, закліканых прадэманстраваць аслабленьне брутальнасьці рэжыму.

Нават калі гэта зьвядзецца да паказальнага вызваленьня двух—трох чалавек, кадравую ракіроўку можна лічыць апраўданай.

На новай пасадзе спадару Васілевічу будзе значна цяжэй карыстацца белымі пальчаткамі. Напярэдадні выбары ды іншыя ўсплёскі палітычных жарсьцяў, якім наша ўлада прывыкла даваць рады вожыкавымі рукавіцамі.

# У ценю крамлёўскіх зорак

Палітыка ЭС у дачыненьні да Беларусі ня толькі не забясьпечвае выкананьне заяўленых ёй мэтаў, але фактычна заахвочвае беларускія ўлады да правядзеньня новых рэпрэсій. Пішуць **Дзяніс Мельянцоў** і **Віталь Сіліцкі**.

Аўдыенцыя Лукашэнкі ў Сочы засьведчыла ня толькі захаваньне геапалітычнага патранажу Расеі над афіцыйным Менскам, але і гатоўнасьць апошняга яго прыняць.

Беларуска-расейскія дачыненьні ў чарговы раз уваходзяць у пэрыяд няпэўнасьці, калі пад пытаньне ставіцца ня толькі іх далейшы лёс, але і мэты асноўных гульцоў. Нягледзячы на, здавалася б, глыбокую інстытуцыяналізацыю і нават руціннасьць практычна ўсіх аспэктаў беларуска-расейскага саюзу шэраг пытаньняў застаецца нявысьветленым. Да іх адносяцца цэны на энэрганосьбіты, пра перагляд якіх дэ факта заявілі некаторыя расейскія чыноўнікі, лёс магчымых прыватызацыйных праектаў і, нарэшце, лёс самога палітычнага праекту, вядомага пад назвай «саюзная дзяржава».

На наш погляд, новы віток няпэўнасьці зьвязаны з карэкціроўкай абвешчанага ў 2006 годзе курсу на «маркетызацыю» беларуска-расейскіх эканамічных дачыненьняў, які зьдзейсьніла расейскае кіраўніцтва ў другой палове 2007 году. Пры гэтым беларуска-эўрапейскія стасункі ўсяго толькі адлюстроўваюць шэраг пэратурбацыяў і пацяпленьняў у адносінах паміж афіцыйнай Масквой і Менскам.

Выдзяленьне ў сьнежні 2007 году стабілізацыйнага крэдыту памерам 1,5 мільярда даляраў ЗША і абвяшчэньне аб плянах новага крэдыту памерам 2 мільярды даляраў ЗША адзначыла фактычны канец накрэсьленага ў 2007 годзе курсу на перавод дачыненьняў паміж Расеяй і Беларусьсю на рынкавыя рэйкі. Пагадзіўшыся ўзяць на сябе новыя абавязкі па падтрымцы беларускай эканомікі, расейскае кіраўніцтва пазбавіла афіцыйны Менск матывацыі да правядзеньня эканамічных рэформаў, якія шырока абмяркоўваліся ў Беларусі цягам мінулага году.

Вынікі перамоваў 14—15 сьнежня 2007 году ня толькі засьведчылі пра захаваньне геапалітычнага патранажу Расеі над афіцыйным Менскам, але і пра гатоўнасьць апошняга яго прыняць. Суворыя выракі шэрагу палітычных апанэнтаў беларускіх уладаў у сьнежні 2007 — студзені 2008 і пачатак новага шэрагу крымінальных справаў азначалі, на думку многіх экспэртаў, канчатковы правал спробаў дыялёгу паміж Беларусьсю і Эўрасаюзам, у якім афіцыйны Менск больш ня меў патрэбы.

На тое, што стасункі паміж Беларусяй і Расеяй вяртаюцца ў фармат, вядомы яшчэ з дапуцінскіх часоў, паказвалі і выказваньні вышэйшых кіраўнікоў РФ, такіх, як прэм’ер-міністар Расеі Валеры Зубкоў, які абяцаў пры падпісаньні пагадненьня аб стабілізацыйным крэдыце «не дать Беларусь в обиду».

У студзені 2008 году Менск наведаў міністар замежных справаў РФ Сяргей Лаўроў. Падчас візыту бакі дамовіліся пра сумесныя дзеяньні і агульную замежнапалітычную стратэгію. На практыцы такое пагадненьне выглядала як гарантыі з боку Масквы афіцыйнаму Менску аб безумоўнай страхоўцы апошняга перад дэмакратызуючымі памкненьнямі Захаду.

Нарэшце, прэзыдэнт Беларусі А.Лукашэнка атрымаў беспрэцэдэнтную (калі ўлічыць амаль гадавую адсутнасьць кантактаў паміж першымі асобамі перад сьнежнем 2007) аўдыенцыю ў Сочы ў лютым 2008 г., падчас якой вышэйшыя кіраўнікі Расеі і імаверны будучы прэзыдэнт РФ Дзьмітры Мядзьведзеў не саромеліся на знакі ўвагі прэзыдэнту Беларусі.

Сытуацыя, аднак, пачала атрымліваць новы кірунак у канцы студзеня 2008 году зь нечаканым пачаткам працэсу вызваленьня палітычных зьняволеных — працэсу, лёгіка якога не адпавядала таму, што адбывалася ва ўнутранай палітыцы Менску з часоў сьнежаньскага саміту.

Яшчэ больш нечаканай стала сустрэча беларускага лідэра з паслом ФРГ Гебхартам Вайсам пры канцы сьнежня 2007 году. Вызваленьне аднаго з найбольш вядомых палітзьняволеных Артура Фінькевіча (прысуд якому ў сьнежні 2007 г. сыгналізаваў, здавалася б, канец «пацяпленьню» ў беларуска-эўрапейскіх дачыненьнях) канчаткова пацьвердзіў імавернасьць сур’ёзнага гандлю паміж Беларусьсю і ЭС, што падняло пытаньне, якім чынам на час пачатку і зьмест гэтага гандлю паўплывалі новыя павароты ў беларуска-расейскіх стасунках і якая магла б быць прырода гэтых паваротаў.

Распаўсюджаныя афіцыйным агенцтвам навінаў БЕЛТА дадзеныя сацыялягічнага апытаньня, зробленага інфармацыйна-аналітычным цэнтрам Адміністрацыі прэзыдэнта РБ, сьведчаць пра нечувана нізкую падтрымку сярод беларусаў ідэі аб’яднаньня з Расеяй у адзіную дзяржаву (толькі каля 3 %). Большасьць рэспандэнтаў (43,7 %) лічаць, што Беларусь павінна застацца незалежнай дзяржавай і будаваць свае стасункі з Расеяй на аснове міжнародных дамоваў, і толькі 42 % выступаюць за саюз незалежных дзяржаваў. Пры гэтым НІВОДНЫ аспэкт беларуска-расейскага аб’яднаньня ня мае большасьці ў беларусаў. Так, за супольную сыстэму абароны выказаліся толькі 21,2% апытаных, за адзіную валюту — 20,4%, за адзінае грамадзянства — 17,8%, за стварэньне супольнай сыстэмы сацыяльнага забесьпячэньня — 11,8 %, за адзінае падатковае заканадаўства — 6,5 % і за адзіную інфармацыйную прастору — 6,4 %. Дадзеныя афіцыйнага аналітычнага цэнтру — самая нізкая ацэнка ўзроўню падтрымкі беларуска-расейскага саюзу ЗА ЎВЕСЬ ЧАС і сярод усіх аналітычных цэнтраў, разам зь недзяржаўнымі. Фактычна, беларускія ўлады пайшлі на прызнаньне таго факту, што ў беларускім грамадстве рэальна дасягнуты кансэнсус аб



**Новы кіраўнік місіі АБСЭ Ганс-Ёган Шміт мае погляды, блізкія да поглядаў пасла Вайса.**

SVABODA.ORG

неабходнасьці захаваньня беларускай дзяржавы.

На наш погляд, публікацыя дадзеных апытаньня — неабвержнае сьведчаньне таго, што тэма рэфэрэндуму аб канчатковым аб'яднаньні Беларусі і Расеі сапраўды ўздымалася Крамлём падчас нядаўніх перамоваў. Таксама відавочна, што афіцыйны Менск абазначыў сваё непрыняцьце такога аб'яднаньня.

Паслаўшы сыгнал пра сваю гатоўнасьць праваліць рэфэрэндум, нават калі ён будзе навязаны Масквой, Менск, фактычна, паставіў крыж на палітычным саюзным праекце, бо правядзеньне рэфэрэндуму мае сэнс для Крамлю толькі ў выпадку неаспрэчнай легітымнасьці апошняга.

Чарговае паляпшэньне стасункаў з ЭС выглядае як спроба з боку афіцыйнага Менску мінімізаваць магчымыя непажаданыя наступствы сваёй пазыцыі ў пытаньні далейшага лёсу саюзнага праекту. Беларуска-расейскія дачыненьні, такім чынам, па-ранейшаму разьвіваюцца па звыклым коле — абяцаньне стратэгічнага партнэрства і больш шчыльнай інтэграцыі — незадаволенасьць Крамлю цаной эканамічнай падтрымкі Беларусі — канфліктная сытуацыя ў беларуска-расейскіх дачыненьнях — рэвэрансы ў бок афіцыйнага Менску Эўрасаюзу — заклапочанасьць у Крамлі магчымай «стратай Беларусі».

Тое, што Масква ня можа, а Менск не жадае выйсьці з гэтага кола, выклікана глыбіннымі прычынамі, якія ня зводзяцца да палітыкі альбо інтарэсаў канкрэтных палітычных лідэраў.

У сваёй палітыцы датычна Беларусі Крэмль перасьледуе дзьве мэты, што адна другую выключаюць, — па-першае, гэта максымальнае тармажэньне працэсу афармленьня Беларусі як нацыянальнай дзяржавы з уласнай ідэнтычнасьцю і геапалітычнымі інтарэсамі, па-другое — гэта максымальнае зьніжэньне кошту ўтрыманьня Беларусі ў сваёй арбіце. Але адной з гэтых мэтаў немагчыма дасягнуць, не адмовіўшыся ад другой. «Пагоня за двума зайцамі» з боку Крамлю стварае сытуацыю, якую па-майстэрску выкарыстоўвае афіцыйны Менск для вырашэньня сваіх задач.

Пры гэтым палітыка Беларусі ў адносінах да ЭС застаецца пераважна функцыяй таго, што адбываецца ў беларуска-расейскіх дачыненьнях, а палітыка Эўрасаюзу датычна Беларусі па-ранейшаму зьяўляецца ня больш чым рэакцыяй на дзеяньні афіцыйнага Менску.

«Рэактыўны» падыход ЭС, заснаваны на ўзаемнасьці ў адказ на пэўныя прыхільныя крокі з боку афіцыйнага Менску азначае, што эўраінстытуты вымушаныя чакаць чарговай канфліктнай фазы ў беларуска-расейскіх дачыненьнях для таго, каб на іх зьвярнулі ўвагу.

Падрыхтоўка да новай перамоўнай фазы ў беларуска-эўрапейскіх дачыненьнях азначае для афіцыйнага Менску не выкананьне ўмоваў ЭС (выкладзеных у non-paper Эўрапейскай Камісіі ад 22 лістапада 2006 году), а наадварот, у адыходзе ад іх. У якасьці жэсту добрай волі потым выкарыстоўваецца адмена альбо зьмякчэньне прынятых напярэдадні рэпрэсіўных мераў — напрыклад, вызваленьне нядаўна асуджаных зьняволеных.

Такім чынам, рэактыўная палітыка ЭС ня толькі не забясьпечвае выкананьне заяўленых ёй мэтаў, але і наадварот, стварае адваротную матывацыю для беларускіх уладаў.

Акрамя таго, ЭС па-ранейшаму ня мае магчымасьці праводзіць цалкам узгодненую замежную палітыку ў рамках Саюзу. Больш за тое, асобныя краіны-сябры кіруюцца ўласнымі інтарэсамі ў правядзеньні «ўсходняй палітыкі» (што і было прадэманстравана падчас сустрэчы сп. Вайса з Аляксандрам Лукашэнкам, а таксама падчас прэс-канфэрэнцыі з паслом Францыі ў Беларусі спадарыняй Мюсо). Спроба надаць дзеяньням нямецкага пасла бачнасьць кансалідаванага падыходу эўрапейскіх краінаў (альбо, прынамсі, Францыі і Нямеччыны) можа тлумачыцца як замежнапалітычнай падтрымкай Нямеччыны, так і асабістым інтарэсам Францыі.

Аналізуючы дзеяньні ЭС у дачыненьні да Беларусі, нельга забываць і яшчэ пра адзін немалаважным фактар — працэс адкрыцьця ў Беларусі дэлегацыі Эўрапейскай Камісіі (фактычна, консуляту ЭС) знаходзіцца на этапе заканчэньня, і ад дзеяньня і рыторыкі эўрапейскіх чыноўнікаў у дадзены канкрэтны пэрыяд залежыць, калі кіраўнік Беларусі дасьць дабро на падпісаньне дамовы паміж урадам Беларусі і Эўракамісіяй.

Такім чынам, чарговая імітацыя збліжэньня Беларусі з Эўропай дала эўрапейскім палітыкам магчымасьць скарыстацца з такой сытуацыі для вырашэньня ўласных надзённых праблемаў. У рэальнасьць пераарыентацыі Беларусі на Захад ва ўмовах сучаснай палітычнай сыстэмы ніхто, відаць, ужо ня верыць.

Застаецца, аднак, пытаньне – ці не зьяўляюцца апошнія захады нямецкага і францускага амбасадараў адзінай магчымасьцю дзеля таго, каб знайсьці хоць нейкія рычагі ўздзеяньня на афіцыйны Менск, нават калі імавернасьць посьпеху іх дзеяньняў мінімальная.

# Новая газавая вайна

Украінска–расейскі канфлікт скончыўся адмовай ад пасярэднікаў у пастаўках расейскага газу.

Расея ня стала адключаць газ Украіне. Кіеў пачне пагашаць запазычанасьць перад «Газпромам» зь чацьвера. Такія дамоўленасьці былі дасягнутыя на сустрэчы прэзыдэнта Ўкраіны Віктара Юшчанкі і прэзыдэнта Расеі Ўладзімера Пуціна.

На пачатку лютага паміж Украінай і Расеяй разгарэўся чарговы газавы канфлікт. Яго справакавала Юлія Цімашэнка: сваімі спробамі арганізаваць пабудову газаправоду з Туркмэніі ў абыход Расеі, а найперш — дабіцца, каб Масква адмовілася ад пасярэдніка ў форме няясна каму належнай структуры RosUkrEnergo і пачала прадаваць газ Кіеву наўпрост, паводле беспасрэдных дамоваў паміж «Газпромам» і «Нафтагазам Украіны». Пры гэтым падвышэньне цаны на газ Цімашэнка прапаноўвала кампэнсаваць павышэньнем тарыфу на яго транспартоўку праз тэрыторыю Ўкраіны.

Украінскі ўрад ад словаў пра ліквідацыю пасярэднікаў перайшоў да справаў. Спачатку Кабінэт міністраў абмежаваў прысутнасьць «УкрГаз-Энэрга» (даччынай структуры RosUkr Energo і НАК «Нафтагаз Украіны») на ўнутраным рынку. А 6 лютагаануляваў сваё распараджэньне аб стварэньні «УкрГаз-Энерго».

У адказ у панядзелак «Газпром» прыгразіў з аўторка на чвэрць скараціць падачу расейскага газу ва Ўкраіну. Падставай стала запазычанасьць па наяўных плацяжах у памеры 1,5 млрд даляраў. Прэс-сакратар старшыні праўленьня ААТ «Газпром» Сяргей Купрыянаў супраvадзіў ультыматум адпаведнай статыстыкай: 1 млрд 700 млн кубамэтраў расейскага газу «аселі» ва Ўкраіне за студзень — люты 2008 г., даводзіў ён.

Выканаць патрабаваньні ўкраінскаму боку прапаноўвалася акурат у дзень прыезду прэзыдэнта Ўкраіны Віктара Юшчанкі ў Маскву.

Напярэдадні паездкі В.Юшчанкі ў Маскву ўкраінскія ўлады ня мелі адзінства. Ю.Цімашэнка выступала за больш радыкальны падыход, прэзыдэнт Украіны настойваў на кампрамісе. Урэшце ўкраінцы пагадзіліся на часовае існаваньне RosUkrEnergo — на пераходны пэрыяд, пакуль ня будуць выпрацаваныя новыя ўмовы контрактаў. Разьлік расейцаў на кампрамісны настрой Юшчанкі апраўдаў сябе: у часе аўторкавай сустрэчы прэзыдэнтаў Расеі і Ўкраіны была дасягнутая дамоўленасьць аб пагашэньні Кіевам запазычанасьці па наяўных плацяжах пачынаючы з чацьвера. «Мы шкадуем, што пастаянна ўзьнікаюць такія праблемы, — сказаў Пуцін. — Мы дамовіліся пра далейшыя прынцыпы супрацоўніцтва і пра ўмовы пагашэньня запазычанасьці. «Газпром» яны задавальняюць».

Пры гэтым за пастаўкі 2008 г. Украіна будзе плаціць па-ранейшаму $179 за тысячу кубамэтраў. Расейскі кіраўнік зазначыў таксама, што «Газпром» і «Нафтагаз» стварылі рабочую групу для арганізацыі наўпростых стасункаў. «Мы зацікаўленыя, каб нашае супрацоўніцтва было гранічна празрыстым», — заявіў У.Пуцін.

У сераду ў Навасібірску першы віцэ-прэм’ер Дзьмітры Мядзьведзеў заявіў, што пры пастаўках сярэднеазіяцкага газу ва Ўкраіну пасярэднік захаваецца. Гэта датычыцца ўжо падпісаных кантрактаў.

Схема паставак туркмэнскага газу па газпромаўскіх газаправодах, але праз пасярэдніцкую кампанію RosUkrEnergo была навязаная Ўкраіне ў 2005 г. RosUkrEnergo — структура настолькі таямнічая, што дагэтуль ніхто да канца ня ведае, хто за ёю стаіць. Асобныя СМІ пісалі, што яе прыбыткамі распараджаюцца асобы, блізкія да Пуціна. Іншыя сьцьвярджалі, што В.Юшчанка таксама мае да RosUkrEnergo дачыненьне.

Сёлетні газавы канфлікт нагадаў ранейшыя сутыкненьні Расеі з Украінай і Беларусьсю. Узьнікненьне такіх сытуацый было б немагчымае, калі б беларускі і ўкраінскі ўрады выпрацавалі супольную стратэгію дачыненьняў з манаполіяй.

Са словаў аглядальніка газэты «Белорусы и рынок» Тацяны Манёнак, пэўныя перамовы вяліся цягам апошніх гадоў. «Паміж краінамі былі апрабаваныя адпаведныя захады і яны мелі эфэкт — маю зьвесткі, што Расею гешэфты Беларусі і Ўкраіны ў сфэры транзыту вельмі напалохалі», — кажа Т. Манёнак. Але пакуль відавочна, што кожны бок аддае перавагу сэпаратным перамовам з Расеяй. Беларусь пры гэтым кіруецца дамоўленасьцямі, дасягнутымі пры канцы 2006 г. Тое, што цана газу для Беларусі на I квартал гэтага году была агучаная пасьля візыту ў нашу краіну Ўладзімера Пуціна, яшчэ раз сьведчыць, што пытаньне вырашалася ў палітычнай плашчыні. Беларускі бок карыстаецца перадвыбарчай сытуацыяй у Расеі вельмі актыўна. Гэта зьвязана з ростам цаны на нафту і, адпаведна, непазьбежным ростам цаны газу.

Паводле папярэдніх зьвестак, па стане на 1 студзеня 2009 г. расейскі газ можа каштаваць для беларусаў каля $203 за тыс. куб. м. На апошніх перамовах, што адбыліся з санкцыі кіраўніка расейскага ўраду Віктара Зубкова, беларуская дэлегацыя выступала за перагляд гэтай лічбы. Перамовы пакуль скончыліся безвынікова і маюць аднавіцца ў сакавіку. Беларускі бок кіруецца кароткатэрміновымі пэрспэктывамі атрыманьня ад «Газпрому» саступак — фіксаваньня, няхай і на кароткі тэрмін, цэнаў, «пэрсанальнай» формулы разьліку цаны на газ і г. д.

Урад карыстаецца тым, што расейцы не гатовыя да газавай вайны на два франты, але і сам намагаецца не злаваць манаполію, зважаючы на багаты выбар у апошняй спосабаў уплыву на нашую эканоміку.

«На жаль, энэргетычная залежнасьць Беларусі, і без таго татальная, яшчэ больш паглыбляецца, і ў кароткай пэрспэктыве не выпадае чакаць на супольную з украінцамі стратэгію дачыненьняў з манапалістам», — зазначыла Т.Манёнак.

**Сямён Печанко**

### Сідорскі размаўляў зь Цімашэнкай

Як паведамяюць афіцыйныя крыніцы, 6 лютага прэм’ер-міністры Беларусі і Ўкраіны абмеркавалі актуальныя пытаньні двухбаковага супрацоўніцтва. У прыватнасьці, былі разгледжаныя пытаньні нарошчваньня экспартных паставак беларускай прадукцыі ва Ўкраіну.

# Экспэрт: Расея газ не перакрые, бо ёй няма куды яго падзець

Дырэктар Інстытуту трансфармацыі грамадзтва (Кіеў) Алег Соскін адказаў на пытаньні «НН» наконт газавага канфлікту паміж Украінай і Расеяй.

**Алег Соскін**, дырэктар Інстытуту трансфармацыі грамадзтва (Кіеў): Ня думаю, што «Газпром» пойдзе на такі крок. Хутчэй за ўсё працягнуцца перамовы. Калі Украіна канчаткова адмовіцца да паслугаў пасярэднікаў, то плаціць давядзецца на $100 больш, але не $314, як кажа Расея.



**«НН»: Дапусьцім, «Газпром» усё-ткі спыніць пастаўкі, што адбудзецца ў такім разе?**

**АС:** Тэхнічна гэта немагчыма. Куды ў такім разе Расея падзене свой газ? Ці мае яна газасховішчы такога аб'ёму? У абыход Украіны гэты газ ня пойдзе. Можна зьменшыць аб'ёмы паставак, але Ўкраіна можа ў такім разе адбіраць на свае патрэбы набыты ў Азіі аб'ём газу. Акрамя таго, гэта будзе скандал, якога Эўропа яшчэ ня бачыла.

**«НН»: Чаму дагэтуль няма супольнай беларуска-ўкраінскай стратэгіі дачыненьняў з расейскай нафтагазавай манаполіяй?**

**АС:** Найперш гэта віна нашага кіраўніцтва. І Юшчанкі, і Януковіча, якія проста павінныя былі дамовіцца з Аляксандрам Лукашэнкам. У ідэале такую стратэгію трэба было задзейнічаць ад самага пачатку, калі нашыя краіны атрымалі ў выніку распаду СССР незалежнасьць.

**«НН»: Ці магчымыя зьмены ў гэтым кірунку ў кароткай пэрспэктыве?**

**АС:** Думаю, што на гэта здольная наша прэм'ер-міністарка Юлія Цімашэнка. Ёй трэба наведацца ў Менск з камандай разумных людзей. Стварыўшы супольны газавы кансорцыюм, мы здолеем аслабіць ціск манаполіі, выставіць ёй свае патрабаваньні і ўмовы, пачынаючы з справядлівага падвышэньня транзытнага тарыфу. Прыклад: возьмем цану газу — за апошні час яна ўзрасла з $40 за тысячу кубамэтраў да $320. Адпаведна тарыф, які сёньня складае $1,7, павінен раўняцца $9.

**Гутарыў Сямён Печанко**




**Гэтымі днямі ў Менску праходзіць спэцыялізаваная выстава «Ядзерная энэргія-2008». На ёй прадстаўлены і макет беларускай АЭС.**

## СЬЦІСЛА

### 2007 год рэкордны ў прыцягненьні інвэстыцыяў

У 2007 годзе ў Беларусь прыцягнута больш за $5,4 млрд замежных інвэстыцыяў, у тым ліку ўпершыню — $1,3 млрд наўпростых замежных інвэстыцыяў. У цэлым за 2007 год інвэстыцыі ў гаспадарку, унутраныя і замежныя, склалі 25,3 трлн руб.

### Мінсувязі ўшчувае «БеСТ» і «БелСел»

«БеСТ» і «БелСел» ня выканалі паказчыкі па паслугах сувязі, а іх фінансавы стан у крытычнай сытуацыі, заявіла намесьніца міністра сувязі Ларыса Лабковіч. Гадавое заданьне па аказаньні платных паслуг «БеСТ» выканаў на 13%, а «БелСел» — на 58%. Пры гэтым спн.Лабковіч удакладніла, што кампаніі атрымалі заданьні з улікам іх жа прапановаў. «БеСТ» абслугоўвае 181,6 тысяч абанэнтаў, сетка апэратара пакрывае 24% тэрыторыі Беларусі. Абанэнцкая база «БелСел» складае 92,7 тысяч карыстальнікаў, ахоп тэрыторыі — 52,5%. У аднаго зь лідэраў рынку — МТС — абанэнцкая база 3,8 млн чалавек, пакрыцьцё тэрыторыі — каля 88%, а гадавы прыбытак — каля 392 мільёнаў даляраў у эквіваленце.

### Рэзэрвы скараціліся

Паводле Нацбанку, паводле стану на 1 лютага золатавалютныя рэзэрвы Беларусі скараціліся на 1,3% да $4,928 млрд. Паводле стану на 1 студзеня яны складалі $4,993 млрд. Валютныя рэзэрвы скараціліся на 3,5% да $3,918 млрд. Аб'ём каштоўных мэталаў павялічыўся на 9,6% (да $928,2 млн).

**СП; www.bsb.by; БелаПАН**

Прадаецца

дзейная **жывёлагадоўчая фэрма**

да 2500 галоў сьвіньняў адначасовай пастаноўкі

Магчымае здаваньне ў арэнду

Разгледзім іншыя прапановы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва

**Тэл.: 8 017 220 59 45**

# Шура-бура вакол нафты і Ломаця

Аляксандар Лукашэнка падтрымаў прапанову Камітэту дзяржкантролю аб стварэньні рабочай групы па комплекснай праверцы рэалізацыі нафтапрадуктаў.

Як паведаміла прэс-служба А.Лукашэнкі, гэтая прапанова прагучала 11 лютага падчас дакладу старшыні КДК Зянона Ломаця, які паінфармаваў А.Лукашэнку аб выніках працы ведамства ў студзені. Прадугледжваецца, што ў рабочую групу ўвойдуць прадстаўнікі КДК, Генпракуратуры, МУС і КДБ.

Афіцыйна гэта тлумачыцца там, што, маўляў, падчас праверак на некаторых аўтазапраўках была выяўлена наяўнасьць дызпаліва ў бэнзыне АІ-95. Аднак справа, канечне, ідзе аб перадзеле сфэраў уплыву і прыбыткаў ад гандлю нафтай і нафтапрадуктамі.

Менавіта жаданьне Камітэту дзяржаўнага кантролю (ці кагосьці над ім) праверыць нафтавы рынак выклікала шуру-буру вакол Зянона Ломаця. Хваля чутак і кампраматаў у дачыненьні да яго пракацілася ў апошнія тыдні.

Гэтак, інтэрнэт-СМІ распаўсюджвалі чуткі пра атручэньне кіраўніка КДК Зянона Ломаця парамі ртуці. СМІ, у прыватнасьці, паведамлялі, што З.Ломаць у рабочым кабінэце знайшоў шарыкі ртуці, а праз некаторы час «адчуў сябе дрэнна і зьвярнуўся па мэдыцынскую дапамогу». Іншыя СМІ плявузгалі, што супраць З.Ломаця распачатая крымінальная справа. У прэсслужбе Камітэту дзяржкантролю ўсе гэтыя чуткі зьняпраўдзілі.

**Мікола Бугай**

# Мілінкевіча стамілі прарасейскія сілы

У панядзелак у Магілёве адбыўся чарговы ўстаноўчы сход «Руху «За Свабоду».

Сход зьбіраўся дзеля фармальных працэдураў, неабходных для рэгістрацыі «Руху» ў Мін’юсьце. Аляксандар Мілінкевіч выкарыстаў яго, каб заявіць, што «цяжка супрацоўнічаць з палітычнымі партыямі, погляды якіх на далейшае разьвіцьцё Беларусі дыямэтральна супрацьлеглыя дэмакратыі і незалежнасьці краіны».

Гэта ўжо трэцяя спроба грамадзкага аб’яднаньня афіцыйна аформіць сваё існаваньне. У мерапрыемстве ўдзельнічала больш за 60 чалавек з розных гарадоў. Пасьля таго, як ўсе пратакольныя пытаньні былі вырашаныя, удзельнікі абмеркавалі палітычную сытуацыю ў краіне і далейшыя пляны дзеяньня. Настрой быў сьвяточным, многія былі нават зьдзіўленыя адсутнасьцю перашкод з боку ўлады.

Ізноў абраны старшыня «Руху» А.Мілінкевіч заявіў, што «нам патрэбнае адзінства ня толькі ў барацьбе з дыктатурай, але і ў поглядах на разьвіцьцё свабоднай Беларусі». Меліся на ўвазе, перш за ўсё, палітычныя хаўрусьнікі камуністычных і прарасейскіх поглядаў. Меркаваньне было цалкам падтрыманае ўдзельнікамі сходу.

Было таксама агучана стварэньне грамадзкага камітэту ў абарону прадпрымальніка Сяргея Парсюкевіча, які цяпер знаходзіцца пад сьледзтвам. Яго абвінавачваюць у тым, што ён нібыта зьбіў міліцыянта на Акрэсьціна, калі адбываў адміністрацыйны арышт пасьля мітынгу прадпрымальнікаў 10 студзеня.

**Яраслаў Сьцешык, Магілёў**

# Бунт на мясакамбінаце

Кепскае фінансавае становішча прадпрыемства выклікае скарачэньні, работнікі пратэстуюць.

У выніку далучэньня Баранавіцкага мясакансэрвавага камбінату да Бярозаўскага было запляванавае перапрафіляваньне заводу: закрыцьцё разнога і кансэрвавых цэхаў ды пашырэньне кілбаснага і кулінарнага.

На камбінаце працавалі 600 чалавек. Ад пачатку году больш за 50 чалавек звольніліся, яшчэ 100 чакае скарачэньня. Збольшага гэта тычыцца адмысловых прафэсіяў, такіх як тэхноляг ці абвальшчык мяса.

У складанай сытуацыі апынуліся больш за 30 працоўных кансэрвавага цэху. Новае кіраўніцтва прапанавала ім сысьці на два месяцы за свой кошт, каб потым атрымаць кампэнсацыю за скарачэньне. Ці звальняцца раней, але без грашовай дапамогі.

Абураныя рабочыя сабраліся ў пятніцу 1 лютага каля канторы. Да іх прыехаў намесьнік старшыні райвыканкаму.

Пасьля зьяўленьня рэпартажаў пра падзеі на камбінаце ў мясцовых незалежных газэтах «Шаг» і Intex-Press 7 лютага на камбінат завіталі супрацоўнікі КДБ. Іх цікавіў настрой людзей. Галоўнае, каб усё было ціха і не было эксцэсаў ды гучных акцый, папярэджвалі яны.

**Іван Кавяра, Баранавічы**

# Прадпрымальнікі пагражаюць выставіць намёты на Кастрычніцкай плошчы

Лідэры прадпрымальніцкага руху 7 лютага правялі прэс-канфэрэнцыю. Галоўныя яе мэты — цьвяроза зірнуць на падзеі студзеня, а таксама расказаць пра пляны перад акцыяй 18 лютага.

«Сёньня нас, лідэраў прадпрымальніцкага руху, спрабуюць сутыкнуць ілбамі, неяк пасварыць», — сказаў старшыня кампаніі «За свабоднае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» Віктар Гарбачоў.

Паводле ягоных словаў, на сёньня ў краіне не працуюць 40 % індывідуальных прадпрымальнікаў. Прычына — ня толькі страйк, частка пераафармляе дакументы, іншыя зьбіраюцца зьяжджаць у Расею, каб працягваць бізнэс там. Гарбачоў прывёў цікавы момант: у мэтро, на радыё і тэлебачаньні цяпер ідзе рэклама арэнды гандлёвых пунктаў на Камароўскім рынку. Прычым, патэнцыйным уласьнікам абяцаюць 30%-я зьніжкі. Раней проста так трапіць на Камароўку было амаль немагчыма.

Патрабаваньні прадпрымальнікаў застаюцца ранейшымі: адмена ўказу прэзыдэнта № 760; прыняцьце закону аб малым бізнэсе; спыненьне перасьледу прадпрымальніцкіх лідэраў. Менавіта пад такімі лёзунгамі і павінна прайсьці акцыя 18 лютага, якую прадпрымальнікі хочуць пачаць а 12:00 на Кастрычніцкай плошчы.

Алесь Макаеў прапануе радыкальны мэтад змаганьня за свае правы: «Трэба ставіць намёты на Кастрычніцкай плошчы і стаяць да той пары, пакуль улады ня пойдуць на саступкі». Паводле ягонай інфармацыі, на 16—17 лютага ўсіх прадпрымальнікаў Гомельшчыны выклікаюць у падатковыя службы.

Старшыня аргкамітэту па стварэньні прадпрымальніцкага прафсаюзу «Разам» Мікалай Рамашын лічыць, што з ІП можа скласьціся такая ж сытуацыя, што з будаўнікамі, які масава зьяжджаюць на заробкі ў Расею.

«Сёньня можна гаварыць упэўнена, што прадпрымальнікі будуць удзельнічаць у парлямэнцкіх выбарах. Прычым, ня толькі, як сябры чыіхсьці выбарчых груп, але і як кандыдаты. Сёньня мы маем некалькі моцных кандыдатаў са сваімі камандамі, якія пазмагаюцца за месца ў парлямэнце. Хачу таксама паведаміць, што большасьць дробных гандляроў у рэгіёнах гатовая падтрымаць акцыю на Дзень Волі», — кажа В.Гарбачоў.

**Зьміцер Панкавец**

# Паступіць у ВНУ змогуць толькі сябры БРСМ?

Стаў вядомы пералік спэцыяльнасьцяў, пры паступленьні на якія да абітурыентаў будуць прад'яўляцца «асаблівыя патрабаваньні». Спачатку меркавалася, што адбор тых, хто мае права на іх паступаць, будуць ажыцьцяўляць аддзелы ідэалёгіі і БРСМ на месцах, аднак унівэрсытэцкаму лобі ўдалося пакуль перанесьці адбор на ўзровень ВНУ.

А.Лукашэнка падпісаў адпаведны ўказ 8 лютага. Як вынікае зь яго, да спэцыяльнасьцяў, якія трапляюць пад «асаблівыя патрабаваньні», адносяцца: «дзяржаўнае кіраваньне», «дзяржаўнае кіраваньне і права», «міжнародныя адносіны», «міжнароднае права», «правазнаўства», «журналістыка», «міжнародная журналістыка», «мытная справа». Парадак «прафэсійна-псыхалягічнага» сумоўя ўстанаўлівае Міністэрства адукацыі.

**МБ;**
**інф.БелаПАН**

## СЬЦІСЛА

### Беларусь гатова аб'явіць мараторый на сьмяротную кару

Такую думку выказаў старшыня пастаяннай камісіі па заканадаўстве і судова-праваўвых пытаньнях ППНС Аляксандар Архіпаў. У 2007 годзе было вынесена толькі 3 смяротныя прыгаворы, у мінулыя гады іх было болей.

### «Amnesty International» у абарону Зьдзьвіжкова

Міжнародная праваабарончая арганізацыя «Amnesty International» заклікае да неадкладнага вызваленьня былога намесьніка галоўнага рэдактара газэты «Згода» Аляксандра Зьдзьвіжкова. Паводле «Amnesty International», Зьдзьвіжкоў ёсьць «вязьнем сумленьня», а передрукаваныя ім з інтэрнэту ў газэце карыкатуры на прарока Мухамэда — «звычайная рэалізацыя свабоды на самавыяўленьне». Як падкрэсьлівае ў сваім звароце гэтая міжнародная праваабарончая арганізацыя, супраць прысуду журналісту выступіла нават кіраўніцтва аб'яднаньня мусульманаў Беларусі.

**МБ**

# «Небясьпечнейшыя за апазыцыю»

Група жанчынаў — сваячак асуджаных, а таксама нязгодных з рашэньнямі судоў у сваіх грамадзянскіх справах — зладзілі прэс-канфэрэнцыю. Яе тэмай была ацэнка дзейнасьці сучаснай судовай сыстэмы Беларусі: ці заўсёды выракі судоў справядлівыя і абгрунтаваныя, і як хутка выпраўляюцца імаверныя памылкі судзьдзяў.

Сустрэча была пабудаваная ў форме маналёгаў. «Людзі, што сёньня тут сабраліся, распавядуць розныя жыцьцёвыя гісторыі. Але іх яднае адно — неабгрунтаваныя і несправядлівыя прысуды супраць іх, ці іхных блізкіх, а таксама незаконнае ігнараваньне іхных спробаў аднаўленьня справядлівасьці з боку чыноўнікаў», — адзначыла юрыст Тамара Сяргей.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

Гісторыі, што пачулі прысутныя, былі вельмі розныя. Ніна Мірановіч з Жодзіна змагаецца за свайго сына — асуджанага на трыццаць гадоў турмы нібыта за забойства былой жонкі.

«У часе сьледзтва сына тры дні трымалі голым у камэры, зьбівалі, парвалі лёгкае, і ён ня вытрымаў — узяў віну на сябе, бо думаў, што суд усё паставіць на месцы», — плачучы расказвае маці.

Паводле ейных словаў, акрамя «прызнаньня» сына, у сьледчых не было ніякіх доказаў.

«Я, Аляксандар Крот, на дадзены момант — бомж. У 2004 г. я атрымаў інваліднасьць, прычына — быў ліквідатарам на ЧАЭС. У тым жа годзе праз суд мая былая жонка пазбавіла мяне ільготаў і жыльля», — распавёў адзін з удзельнікаў сустрэчы, жыхар Менску.

Сп.Крот ня можа зразумець, навошта было аддаваць здароўе ў Чарнобылі, каб гадамі змагацца з чыноўнікамі за свае правы на жыльлё.

Сын Ларысы Качатковай стаў ахвярай менскіх рыэлтэрскіх агенцыяў — і вось ужо некалькі год жанчына шукае праўды ў судах, кабінэтах пракуратуры, піша Лукашэнку лісты: «Я пісала прэзыдэнту, што нашы чыноўнікі наносяць значна большую шкоду ўладзе, чым апазыцыя, але адказу не атрымала».

Ніхто з прысутных ня здолеў адшукаць праўды ва ўласнай краіне паасобку. Паводле словаў Людмілы Кучуры, на свае канкрэтныя пытаньні жанчыны «атрымліваюць адпіскі ад службовых асобаў судоў і Генэральнай пракуратуры», а з многімі зь іх «чыноўнікі наагул спынілі перапіску». Таксама яна раскрытыкавала працу менскага прадстаўніцтва ААН — ейная скарга, дасланая на менскі адрас арганізацыі, дагэтуль не адпраўленая ў Жэнэву. Спн. Кучура кажа, што мае зьвесткі пра выпадкі, калі падобныя скаргі так і не траплялі да разгляду.

Не знайшоўшы падтрымкі і разуменьня ў сваёй краіне, жанчыны згуртаваліся, каб разам паспрабаваць прыцягнуць увагу да сваіх праблемаў па-за межамі Беларусі. Дзеля гэтага яны зладзілі шэраг акцыяў — пікетавалі пасольства Беларусі ў Кіеве, пратэставалі ў Расеі ў часе саміту «вялікай восемкі», накіравалі прэзыдэнту Расеі сем тэлеграмаў з просьбай пасадзейнічаць сустрэчы зь беларускім прэзыдэнтам, а таксама пісалі старшыні ПАРЭ Рэнэ ван дэр Ліндэну.

Жанчыны ўдзельнічалі ў «Сацыяльным маршы» ў лістападзе мінулага году, зьвярталіся зь лістамі да старшыні Вярхоўнага суду Валянціна Сукалы, тагачаснага генпракурора Пятра Міклашэвіча, сакратара Рады Бясьпекі Віктара Шэймана, Мітрапаліта Філарэта. Апошні — адзіны, хто паабяцаў зьвярнуцца да Лукашэнкі з просьбай дапамагчы жанчынам.

Неаднаразовыя звароты да самога прэзыдэнта не прынесьлі плёну. 9 студзеня яны зноў зьвярнуліся ў Адміністрацыю прэзыдэнта з просьбай аб асабістым прыёме, аднак 11 студзеня атрымалі адмову за подпісам начальніка ўпраўленьня па працы са зваротамі грамадзянаў Адміністрацыі прэзыдэнта Станіслава Буко.

«Нашыя чыноўнікі ў СМІ расцэньваюць увагу міжнародных структураў да пытаньняў правоў чалавека ў Беларусі, як умяшаньне ва ўнутраныя справы краіны», — заўважае Ларыса Качаткова.

Яна лічыць, што ў сытуацыі, калі праблемы грамадзянаў ігнаруюцца ўладамі ўласнай краіны, увага і падтрымка з боку іншых краінаў будзе вітацца пакрыўджанымі: «Наш прэзыдэнт не сустрэўся з намі, і таму я ўдзячная амэрыканскаму пасольству і асабіста прэзыдэнту ЗША за тое, што ён гэты час знайшоў, адказаў на наш ліст, удзячная за ўвагу да нас», — сказала жанчына.

«У дадзеным выпадку чыноўнікі маюць справу не з апазыцыйнымі палітыкамі, зь якімі яны ўжо даўно выпрацавалі надзейны мэханізм дачыненьняў», — падкрэсьліла пры канцы сустрэчы Тамара Сяргей. Цяпер улада сутыкнецца з простымі людзьмі, якія ад яе пацярпелі і пачалі арганізоўвацца, каб дамагчыся справядлівасьці. Самаарганізацыя пакрыўджаных грамадзянаў — гэта страшней за апазыцыю, лічыць праўнік.

Па выніках прэс-канфэрэнцыі было вырашана працягваць акцыі пратэсту і рыхтаваць звароты ў дзяржаўныя органы і да замежных арганізацыяў. Была агучаная і падтрыманая ўсімі ідэя выдаць асобным зборнікам справы пацярпелых. Матэрыял сабраны — кожны дакумэнт, усе лісты-адпіскі, засталося толькі надрукаваць.

**Сямён Печанко**

# Пасол Багдонас: «Калі ў Беларусь ня прыйдуць літоўскія інвэстыцыі, то прыйдзе наш «вялікі брат» з Усходу»

У сераду, 13 лютага, пасол Літвы Эдмінас Багдонас даваў прэс-канфэрэнцыю, якая падсумавала першы год ягонай працы ў Беларусі, а таксама праходзіла напярэдадні 90-годзьдзя абвяшчэньня Літвой незалежнасьці, якое будзе сьвяткавацца 16 лютага.

На думку Багдонаса, дыялёг між Беларусьсю і Эўрасаюзам не адбываецца. «Не ідзе гэты дыялёг чамусьці. Калі мы хацелі стаць сябрамі ЭС, то імкнуліся да гэтага дыялёгу любымі шляхамі. Калі перад намі зачынялі адны дзьверы, то мы ішлі праз іншыя. Ня трэба нікога абвінавачваць у тым, што адбываецца цяпер».

Журналістка БЕЛТА спыталася, ці не зьбіраецца Літва зьнізіць цэны на візы для грамадзянаў Беларусі ў адказ на адпаведны крок Беларусі. Такое пытаньне пакінула неўразуменьне ў Э.Багдонаса. «За студзень мы выдалі дзесьці 3 тысячы віз, 30 % зь іх бясплатныя. Гэта ў два—тры разы болей, чым выдаюць нашы калегі ў Вільні. Паглядзіце расцэнкі на сайце беларускага пасольства ў Літве. Гадавая віза каштуе 260 эўра. Наведваць вашу краіну могуць толькі багатыя бізнэсоўцы. Простым грамадзянам рабіць гэта праблематычна», — сказаў пасол. Ён зазначыў, што цяпер абмяркоўваецца пытаньне, каб грамадзянам, якія жывуць за 50 кілямэтраў абапал мяжы, выдаць пасьведчаньні на пяць гадоў, якія дазволяць езьдзіць бязь візаў. Праўда, знаходзіцца па гэтых пасьведчаньнях можна будзе толькі ў межах гэтай пяцідзесяцікілямэтровай зоны», — кажа Э.Багдонас.

Літва зацікаўленая, каб іхныя інвэстыцыі прыходзілі ў Беларусь, але літоўскія прадпрыемствы сутыкаюцца з мноствам бюракратычных перашкодаў. «Вашы газэты пішуць, што ў Беларусі добры інвэстыцыйны клімат, я вам веру. Толькі чамусьці перад нашымі канцэрнамі ставяцца вялікія бюракратычныя шлагбаўмы. Мноства праектаў ляжаць на сталах і ў шафах беларускіх чыноўнікаў, ім не даюць ходу. Я асабіста прашу нашых бізнэсоўцаў інвэставаць у Беларусь, але ёсьць аб'ектыўныя прычыны, якія не дазваляюць нам ісьці сюды поўным ходам. Літоўцы пачалі рэканструкцыю стадыёну «Трактар», але каб цалкам разьвіць інфаструктуру, трэба пабудаваць побач з пляцоўкай некалькі дамоў. Атрымаць дазвол на падобнае будаўніцтва вельмі цяжка. Нашы інвэстыцыі ўкладваюцца ў бровар «Аліварыя», яшчэ ёсьць некалькі праектаў, але гэтага вельмі мала. Калі ў Беларусь ня прыйдуць літоўскія інвэстыцыі, то прыйдзе наш «вялікі брат» з Усходу», — лічыць Э.Багдонас.

Спадара пасла таксама папрасілі падвесьці вынікі свайго першага году працы ў Менску. «Была падпісаная дамова аб дэмаркацыі мяжы — гэта амаль 700 кілямэтраў. Працуе 11 памежных пераходаў, памежнікі і мытнікі добра супрацоўнічаюць. Таваразварот летась павялічыўся на 36%. Ён склаў 1,115 мільярдаў даляраў. Клайпедзкі порт на 20% загружаны беларускімі таварамі, у асноўным каліем. Клайпеда ўвогуле стала ледзьве не беларускім портам», — кажа дыплямат.

**Зьміцер Панкавец**

# «Белая Русь» адказала Баршчэўскаму

Намесьнік кіраўніка грамадзкага аб'яднаньня «Белая Русь» С.Пігараў даслаў адказ старшыні Партыі БНФ Лявону Баршчэўскаму. Ліст кіраўніку «Белай Русі» Аляксандру Радзькову быў накіраваны яшчэ ў першай палове сьнежня, але адказ прыйшоў амаль праз два месяцы. С.Пігараў піша наступнае: «На ўзьнятыя ў Вашым звароце пытаньні неаднаразова даваліся адказы, што шырока адлюстроўваліся ў прэсе, і на сёньня яны ня маюць эфэкту навізны. Таму гэта, на нашу думку, не патрабуе дадатковага абмеркаваньня».

У сваім лісьце палітык і пэдагог Лявон Баршчэўскі збольшага закрануў праблемы, зьвязаныя з сфэрай адукацыі — палітычны ціск у ВНУ, закрыцьцё Гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа, адсутнасьць беларускамоўнай вышэйшай адукацыі. Да апошняга часу не было вядома, дзе ж знаходзіцца юрыдычны адрас «Белай Русі». На лісьце, які прыйшоў Баршчэўскаму, адрас адпраўшчыка пазначаны так: «г.Менск, вул.Фрунзэ, 5-205, РГА «Белая Русь». Варта адзначыць, што па гэтым адрасе месьціцца Дом літаратара.

Сам Баршчэўскі пра адказ «Белай Русі» кажа так:

«Мяне зьдзівіла сама хамская манера дасылаць адказ праз паўтара месяца пасьля таго, як ліст быў накіраваны. Акрамя таго, няма адказу па сутнасьці. Мы прыводзілі мноства фактаў, якіх падручнікаў, контурных карт, вучэбных матэрыялаў на беларускай мове не існуе, як прыцясьняюць студэнтаў, каго выкінулі за палітычныя погляды з ВНУ. І казаць, што недзе ў СМІ на гэтыя пытаньні былі дадзеныя адказы — чыстая бюракратычная адпіска. Гэта паказвае, што арганізацыю «Белая Русь» будуць ствараць на такой вось хамскай аснове».

**ЗП**



Пра два новыя фільмы — афіцыёзны і андэграўндны — піша **Андрэй Расінскі**.

# Дзесяць мільёнаў адданых беларусаў

Новая стужка «Беларусьфільму» **«Шчыт Айчыны»** (рэж. Дз.Скварцоў) наносіць прыцэльныя ўдары па імаверным праціўніку.

«Ірак, 1991. Югаславія, 1999» — сцэны вайны. Разбамбаваныя і расстраляныя абаронцы церпяць паразу.

Расейскі палігон. Паседжаньне сакратарыяту абароны, старшыня якога чамусьці нагадвае расейскага прэм’ера Міхаіла Фрадкова. Генэрал гаворыць пра сакрэтную праграму «Шчыт Айчыны». Адылі дзеяньне разгортваецца ў Беларусі.

Таленавіты лейтэнант Аляксей Стрыжаў запрошаны на працу ў сакрэтны інстытут, дзе знаёміцца зь пекнай дачкой дырэктара. Але прадажны агент (Анатоль Кот) спрабуе выкрасьці дзяржаўныя таямніцы і сапсаваць маладым заручыны…

Рэжысэр Дзяніс Скварцоў, калі навучаўся ў Акадэміі мастацтваў, рабіў цікавую анімацыю, зьдзіўляў мантажом і ракурсамі ў дыплёмнай карціне «Ліка. Дзембельская байка».

Новы фільм Дзяніса Скварцова — дзіўнае спалучэньне сталінскага сюжэту, брэжнеўскай вяласьці і лукашэнкаўскага глямуру.

У 1930-я заходнія шпегі былі гітом на судовых працэсах; кінаэкран палохаў атрутнікамі, забойцамі і выкрадальнікамі «партыйных білетаў». У 1970-я імпэт сьцішыўся, але ідэалягічныя ворагі ў шапку ня спалі і дабіраліся нават да «Дыямантавае рукі».

«Шчыт Айчыны» — бляклая копія старой канфрантацыі. «Агент» Анатоль Кот і «гэбіст» Алег Гарбуз спрабуюць стварыць характары, але канфлікты фільму сьпісаныя з вайсковых статутаў, сюжэт




рассыпаецца. Нікому не патрэбныя аўтагонкі, крышачку сэксу, шпегаўская сходка ў Траецкім перадмесьці (!) — і адсутнасьць чалавечых пачуцьцяў.

«Шчыт Айчыны» спрабуе ўвасобіць «дзяржаўную ідэалёгію» на сучасным матэрыяле. Галоўным мітам рэжыму да нядаўняга часу была вайна. Але сьведкі і героі яе сыходзяць. Трэба шукаць новыя падваліны. «Шчыт Айчыны» — як абвяшчаюць у канцы фільму — гэта дзесяць мільёнаў беларусаў, патрыятычна адданых (вядома каму), правільных.

Сьцьверджаньне завісае ў паветры, канвульсуе гістэрычнай чырвона-зялёнай гамай. Самалёты-зьнішчальнікі й гелікоптэры, пафарбаваныя ў карэктныя камуністычна-ісламскія колеры; гераіня страляе ў ціры ў чырвонай сакольцы; зялёнае і арнамэнт на афармленьні.

Лёгкі лукашэнкаўскі глямур: дарагія аўто, шыкоўныя сукенкі (набор колераў той жа), мадэлькі подыюму — як прызы для пераможца і пазнака «стабільнай квітнеючай Беларусі».

Сталінская ідэйнасьць разбэшчаная спажывецкім азартам. Рэстараны, раскошныя пакоі агента, багатыя вайскоўцы…

Выбух самалёта, некалькі кампутарных заставак і надпісаў мусяць апраўдаць грошы, укладзеныя ў кіно, але тых эфэктаў для поўнамэтражнай стужкі замала.

Стваральнікі фільму ня вераць ва ўласную «выхаваўчую» місію, але галачку ставіць трэба.

# Дабро толькі здаецца безабаронным

**«Вязьні сумленьня»** (рэж. Вольга Мікалайчык) — не без шурпатасьцяў, але бяз фальшу.

Дакумэнтальна-публіцыстычная карціна «Вязьні сумленьня» здымалася некалькімі беларускімі рэжысэрамі на працягу апошніх двух гадоў. Прозьвішчы творцаў у стужцы не пазначаныя, што ў нашых умовах зусім ня дзіўна. Прадусарам і аўтарам 51-хвіліннай карціны выступіла рэжысэрка Вольга Мікалайчык.

Ніякіх закадравых камэнтароў, штучнага патасу; фільм амаль аскетычны — толькі сьведчаньні й любоў блізкіх — і архіўная хроніка. Апэратары карціны зьнялі рэдкія кадры беларускіх калёній — але ня гэта галоўнае.

Ірына Казуліна гатуе ежу для мужа, спатканьні зь якім дазволеныя толькі тры разы на год; бацька Зьмітра Дашкевіча дабраслаўляе выбар свайго



сына, а Марыя Фінькевіч называе сябе «маці рэвалюцыянэра». Бацькі Севярынца апавядаюць пра сына — Паўла фільм засьпеў на лесапавале й па вызваленьні.

Словы юрыстаў і праваабаронцаў удакладняюць карціну, але найважней — асабісты позірк і словы блізкіх.

У асобных кадрах схоплены ня толькі і ня столькі час, палітычнае і асабістае сьведчаньне, але маральны выбар і тое, што стаіць за ім.

Мітусьліва-ваўчынымі жэстамі ціхары раскідаюць сьвечкі, запаленыя ў гонар зьняволеных і зьніклых — а твары свае хаваюць; у вачох міліцыянта, які арыштоўвае Клімава, — разгубленасьць і сорам. «Маладафронтаўцы» выглядаюць самотнымі, а міліцыя згуртаванаю і начышчанай. Але твары адных — прасьветленыя; твары другіх — ананімна-бляклыя. Са сваёй уласнай волі і паводле свайго выбару.

За калючым дротам — царкоўны крыж. Эмблематычны кадар.

Дабро толькі здаецца безабаронным. «Мне шкада гэтага чалавека, — кажа І.Казуліна пра Александра Лукашэнку. — Ён глыбока няшчасны. А мы верым у сьветлае».

Фільм «Вязьні сумленьня» не без шурпатасьцяў. Але ў ім праўда, сэрца і чалавечая салідарнасьць. У канцы стужкі гледачоў заклікаюць пісаць лісты палітзьняволеным — і цяжка ўявіць, што хтосьці не адгукнецца.

Карціна зьнятая для каналу «Белсат» і, магчыма, будзе даступнай на дысках.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ПАДПОЛЬНЫ СПЭКТАКЛЬ ПРА ГЛЯБАЛІЗАЦЫЮ. Свабодны тэатар прэзэнтаваў у Менску на прыватнай кватэры свой новы спэктакль «Грум-Грум», паводле апавяданьня сучаснай нямецкай пісьменьніцы Дэі Лоэр «Бэрлінская гісторыя». Яна пра трагедыю маленькага чалавека ў мэгаполісе.**

## СЬЦІСЛА

### Літаратурны конкурс да 90-годзьдзя БНР

Беларускі ПЭН-Цэнтар, Саюз беларускіх пісьменьнікаў і Беларуская асацыяцыя журналістаў абвяшчаюць літаратурны конкурс «Незалежнасьць – гэта...», прымеркаваны да 90-годзьдзя БНР. Да разгляду прымаюцца літаратурна-публіцыстычныя творы на тэму беларускае незалежнасьці і гадавіны Сакавіка. Аб’ём твораў мае быць ня большы за 6 тыс. знакаў, дасылаць іх можна да 10 сакавіка на e-mail: pen@vessobel.by. Або поштай: 220050, Менск, а/с 218.

### Беларусі перададзены архіў Агінскага

Пасол Расеі перадаў нашай краіне архіў Міхала Клеафаса Агінскага на мікрафільмах і кампакт-дысках. Ён зьмяшчае 6 тысяч лістоў. Ад 1833 г. дакумэнты захоўваліся ў Расеі. На вяртаньне архіву спатрэбілася блізу 6 тыс. даляраў. Перадача сталася магчымай пры падтрымцы ЮНЭСКА.

### Беларуская рок-музыка раскуплялася ў 2007 годзе лепей, чым папса

Паводле вынікаў узнагароджаньня музычнай прэміяй «Містэрыя гуку», ў дзясятцы самых папулярных гуртоў 2007 году — 8 рок-камандаў. Галоўным крытэрам падчас уручэньня прэміі былі афіцыйныя дадзеныя па продажы альбомаў:

1. «J:Морс» («Босиком по мостовой»).
2. «Тяни–толкай» («Как же долго я тебя искал»).
3. N.R.M («06»).
4. «Ляпіс Трубяцкі» («Капитал»).
5. «J:Морс» («Адлегласць»).
6. «beZ bileta» («Кино»).
7. «J:Морс» («Ледаколы»).
8. «Крамбамбуля» («Сьвяточная»).
9. «Da Vinci» («Bum–Bum»).
10. «Крама» («Усё жыцьцё — дзіўны сон»).

### Аляксей Карпюк у «Кнігазборы»

У выдавецтве «Беларускі кнігазбор» выйшаў зборнік твораў Аляксея Карпюка. У кнігу ўключаныя аповесьці «Данута» і «Разьвітаньне з ілюзіямі», драма «Канец сьвету», лісты да Янкі Брыля, Міхася Забэйды-Суміцкага, Максіма Танка, Васіля Быкава, Пятра Машэрава, Міхаіла Гарбачова. Укладальнік кніжкі і аўтар прадмовы — Аляксандар Фядута. Выданьні «Кнігазбору» можна знайсьці ў любой дзяржаўнай кнігарні.

### У Нясьвіскім замку — сьцены-муляжы

Ва ўнутраным двары палацу Радзівілаў разбураны пераход-галерэя — адна з найважнейшых канструкцыйных частак архітэктурнага помніка. Левы ад ўваходу бок палацу выглядае як пасьля бамбаваньня — фасад рухнуў, перакрыцьці зламаныя, перагародкі абсыпаліся. Больш як 160 квадратных мэтраў цяперашняй пустэчы будуць закладзеныя сучаснай цэглай.

### Польшча дапаможа адбудаваць фальварак Напалеона Орды

Польскі бок гатовы аказаць навуковую падтрымку ў аднаўленьні радавога фальварку Напалеона Орды ў Янаўскім раёне (Берасьцейшчына). Дамоўленасць дасягнутая на сустрэчы пасла Беларусі ў Польшчы Паўла Латушкі з намеснікам міністра культуры Польшчы Томашам Мэртам.

**Паводле радыё «Рацыя», Польскага радыё для замежжа, Bulletin Online.org, БЕЛТА**

# Каб служба мёдам не здавалася

Пра Зьмітра Жалезьнічэнку, які зрабіў беспрэцэдэнтны ўчынак — адмовіўся ад прыняцьця прысягі. Піша **Віталь Тарас**.

Быў такі фільм амэрыканскага рэжысэра Сьпілбэрга — «Ратуючы шарагоўца Раяна». Фільм, заснаваны на раэльных фактах, распавядае пра тое, як падчас Другой усясьветнай вайны амэрыканскае войска ратуе жыцьцё аднаго шарагоўца цаной жыцьця іншых вайскоўцаў. Справа вядзецца пра прынцып.

У сытуацыі залюстроўя, у якой мы жывем, усё выглядае абсалютна інакш. Уявіць сабе фільм «Ратуючы навабранца Жалезьнічэнку» сёньня немагчыма.

Служба ў войску, згодна з Канстытуцыяй РБ, ёсьць «сьвятым абавязкам грамадзяніна Рэспублікі Беларусь». Але ж Канстытуцыйны суд прызнаў, што «Асноўны Закон не разглядае вайсковую службу ў якасьці адзінай і безумоўнай, паколькі дае магчымасьць вызваленьня ад вайсковай службы альбо замену яе альтэрнатыўнай». (Рашэньне КС РБ ад 26 траўня 2000 г.) Пры гэтым суд спаслаўся на Камісію ААН па правох чалавека, міжнародныя праўныя акты і г. д.

Але ж не пра гэта я хачу сказаць. І нават не пра Зьмітра Жалезьнічэнку, які зрабіў беспрэцэдэнтны ўчынак — адмовіўся ад прыняцьця прысягі. І якому можа пагражаць зараз крымінальная адказнасьць за гэта.

Гаворка пра тое, што войска ў Беларусі, служыць у якім, па ідэі, павінна быць гонарам, ператвараецца ў інструмэнт пакараньня чалавека. У дадзеным выпадку — чалавека, які не адмаўляецца служыць у войску, але хоча, каб гэта адбывалася паводле закону.

Увогуле ў гісторыі з Жалезьнічэнкам уражвае неймавернае ўменьне ўлады і канкрэтных чыноўнікаў ствараць праблему зь нічога. Прынамсі, ствараць яе там, дзе яна не павінна і не магла ўзьнікнуць, калі б гэтыя самыя чыноўнікі праявілі элементарную павагу да закону, а не да вышэйшага начальства.



**Зьміцер Жалезьнічэнка адмаўляецца прымаць прысягу.**

Усяго толькі й трэ было, што выканаць рашэньне Гомельскага суду, які прызнаў (хай сабе з фармальных прычынаў) загад рэктара аб адлічэньні студэнта 2-га курсу матфаку Жалезьнічэнкі незаконным. Не, склікаюць прафкам і прымаюць, задняй датай, фактычна, рашэньне аб падтрымцы загаду пра адлічэньне. У прызыўной камісіі ў ваенкамаце пасылаюць Жалезьнічэнку на псыхіятрычную экспэртызу ў сувязі з тым, што прызыўнік размаўляе па-беларуску! Потым прыходзяць да высновы, што ён абсалютна здаровы і накіроўваюць у войска. Суд прымае рашэньне аб прыпыненьні прызыву да разгляду грамадзянскай справы аб незаконнасьці прызыву Жалезьнічэнкі. Але ў вайсковай часьці, куды накіроўваюць навабранца, адмаўляюцца падпарадкавацца рашэньню грамадзянскага суду. Адмаўляюцца ўзяць пад разгляд і мэдычную даведку, паводле якой Зьмітру належыць адтэрмінаваньне на шэсьць месяцаў іназіраньне ў лекараў. Само сабой зразумела, не прымаецца пад увагу і факт галадоўкі пратэсту Жалезьнічэнкі.

Тым часам афіцыйны орган Міністэрства абароны выступае з рэдакцыйным артыкулам, у якім валіць усё з хворай галавы на здаровую. Газэта абвінавачвае Жалезьнічэнку ў тым, што ён, нібыта, сябар БНФ. А Партыю БНФ (афіцыйна зарэгістраваную) у сваю чаргу абвінавачвае ў фашызьме і ў… праблемах Жалезьнічэнкі. Удумацца толькі — сілавое міністэрства, апірышча моцы і бясьпекі дзяржавы, фактычна, абвяшчае прапагандысцкую вайну юнаму грамадзяніну Беларусі! Які хоча толькі аднаго — каб у дзяржаве паважалі і ягоныя правы. Генэралы супраць навабранца. Які годны занятак для афіцэраў беларускага войска. А які розгалас на ўсю краіну і на ўвесь сьвет...

Мне гэта міжволі нагадала нядаўнюю гісторыю, якая надарылася ў суседняй дзяржаве. У Маскве хацелі хуценька засудзіць Васілія Алексаняна, прымусіць яго даць паказаньні супраць Хадаркоўскага, які ўжо адбывае тэрмін у зьняволеньні. (Алексанян працаваў у кампаніі Хадаркоўскага «Юкас»). Падсудны пакутуе на дзьве сьмяротныя хваробы — СНІД у апошняй стадыі і рак. Але суд, пракуратура і ФСВП (Фэдэральная служба выкананьня пакараньняў РФ) любым коштам хацелі выбіць паказаньні з Алексаняна, пакуль ён жывы, і таму ігнаравалі ўсе просьбы хворага, а таксама ягоных адвакатаў, праявіць гуманнасьць. Тым ня менш, хваля грамадзкага абурэньня, лісты ў ягоную абарону, падпісаныя вядомымі праваабаронцамі, дзеячамі культуры, палітыкамі, галадоўка салідарнасьці Міхаіла Хадаркоўскага — усё гэта нават ва ўмоўвах пуцінскай Расеі дало, так бы мовіць, кумулятыўны эфэкт. Алексаняна перавялі ў шпіталь, хоць і пакінулі пад аховай. Узровень праблемаў і наступстваў, якія прынесьлі расейскай уладзе няўклюдныя і бесчалавечныя (ў роўнай ступені) дзеяньні чыноўнікаў і судзьдзяў, падаўся крамлёўскім уладам празьмерным, і яны пайшлі на вымушаныя саступкі.

Беларускія чыноўнікі і вайскоўцы ў сувязі са справай Жалезьнічэнкі не адчулі пакуль і сотай долі праблемаў у параўнаньні з маскоўскімі калегамі. Але наша задача і абавязак, я думаю, — гарантаваць самы шырокі розгалас гэтай справы.

Каб ім служба мёдам не здавалася.

# хроніка апазыцыі


Антось Каліноўскі ў судзе.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**5 лютага**

## Шыдлоўскі папрасіў палітычнага прытулку

**Аляксей Шыдлоўскі** чакае разгляду дакумэнтаў на атрыманьне статусу палітычнага ўцекача ў Чэхіі ў спэцыяльным лягеры для ўцекачоў. У Беларусі ў дачыненьні да яго распачатая справа паводле ч. 3 арт. 339 КК («хуліганства»). Яму пагражае 10 гадоў пазбаўленьня волі. Ягоная жонка Марына Лебедзева лічыць, што ейнага мужа справакавалі на бойку, вынікам якой стала крымінальная справа. Нагадаем, у 1998 г. А.Шыдлоўскі быў асуджаны да 1,5 году пазбаўленьня волі за антыпрэзыдэнцкія графіці.

## Ператрус у Кацярыны Салаўёвай

У рамках распачатай супраць **Кацярыны Салаўёвай** крымінальнай справы па арт. 193 ч.1 «Удзел у незарэгістраванай арганізацыі», супрацоўнікі Полацкага КДБ правялі ператрус у кватэры актывісткі незарэгістраванага «Маладога фронту». Нядаўна Кацярыну Салаўёву паўторна адлічылі з Полацкага ўнівэрсытэту.

## Пракуратура папярэдзіла вернікаў

Намеснік пракурора Маскоўскага раёну Менску Дзьмітры Зыранаў уручыў пастару царквы «Новае Жыцьцё» Вячаславу Ганчарэнку другое прадпісаньне. Паводле праўніка царквы Сяргея Луканіна, прадпісаньне забавязвае пастара пусьціць у будынак царквы прадстаўнікоў «Энергаагляду». За ігнараваньне першага прадпісаньня можа быць складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні, паводле якога В.Ганчарэнку могуць пакараць штрафам 20 базавых велічыняў (700 тысяч рублёў).

**6 лютага**

## Вярхоўны суд пакінуў у сіле папярэджаньне КХП—БНФ

Судзьдзя Вярхоўнага суду **Валер Самалюк** вынес рашэньне паводле позвы Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ да Міністэрства юстыцыі. Папярэджаньне, зробленае партыі Мін'юстам, застаецца ў сіле.

**10 лютага**

## Затрымалі пінскага прадпрымальніка

У Пінску на Цэнтральным рынку ў нядзелю затрымалі актывіста прадпрымальніцкага руху **Аляксандра Васільева**. Міліцыянты запатрабавалі, каб ён прайшоў зь імі ў пастарунак. Паводле словаў прадпрымальніка, яму не дазволілі патэлефанаваць родным. У часе апошніх акцыяў прадпрымальнікаў А.Васільева ўжо затрымлівалі за «дробнае хуліганства». Суд праз супярэчлівыя паказаньні сьведкаў–міліцыянтаў прызнаў ягоную віну недаказанай, аднак прысудзіў штраф за непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі.

## Віктар Шэндэровіч заклікае дапамагчы Андрэю Кіму

З такім заклікам расейскі журналіст выступіў на старонках свайго інтэрнэт–дзёньніка. «Я разумею, што на тле нашай гісторыі з Алексанянам усё гэта гучыць досыць побытава, але тым ня менш. У Менску сядзіць у СІЗА Андрэй Кім — актывіст моладзевага руху «Ініцыятыва», сябар маёй дачкі і проста вельмі добры хлопец» — піша ў сваім дзёньніку Віктар Шэндэровіч.

Нагадаем, у дачыненьні да А.Кіма заведзеная крымінальная справа паводле арт. 364 КК («Гвалт, альбо пагроза гвалту ў adносінах да работніка міліцыі»). Нібыта Андрэй падчас мітынгу прадпрымальнікаў 21 студзеня ўдарыў супрацоўніка ДАІ кулаком і расьсек таму брыво да крыві. Яму пагражае да 6 гадоў турмы. Хлопец знаходзіцца ў СІЗА на Валадарскага.

**11 лютага**

## Перашкоды гарадзенскаму АГП

Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сытуацыях забаранілі прымаць у гарадзенскім офісе Аб'яднанай грамадзянскай партыі больш за 15 чалавек. У гэтым памяшканьні ладзіліся, апроч партыйных мерапрыемстваў, канцэрты і культурніцкія імпрэзы. Кіраўнік абласной філіі АГП **Юры Істомін** заявіў, што атрыманая пастанова стала вынікам візыту супрацоўнікаў міліцыі разам з адказнымі асобамі гарадзенскага МНС 2–га лютага. У той дзень у памяшканьні праходзіў канцэрт, прысьвечаны 170–годзьдзю Кастуся Каліноўскага. Тады на імпрэзу сабралася больш за сто чалавек.

## Зь Лінгвістычнага ўнівэрсытэту адлічылі Каліноўскага

Сябра Рады «Моладзі БНФ» **Антось Каліноўскі** афіцыйна адлічаны зь першага курсу Менскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўнівэрсытэту за «непасьпяховасьць і сыстэматычнае парушэньне ўнутранага парадку». Нагадаем, падчас сэсіі **Антось Каліноўскі** быў затрыманы і 10 сутак знаходзіўся на Акрэсьціна. Яму не дазволілі пераздаць экзамэны. Раней з МДЛУ была адлічаная актывістка Моладзі БНФ **Ганна Мядзьведзева.**

## Прадпрымальнік патрабуе суду на роднай мове

Актывіст кампаніі «За свабоднае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» **Віктар Крываль** абвінавачваецца ў «непадпарадкаваньні законным патрабаваньням работнікаў міліцыі». 10 студзеня мікрааўтобус, у якім В.Крываль і яшчэ адзін актывіст кампаніі **Аляксандар Цацура** ехалі ў Менск на акцыю пратэсту прадпрымальнікаў, быў спынены. У А.Цацуры забралі правы, зьвінаваціўшы ў парушэньні правілаў дарожнага руху. Калі прадпрымальнікі скіраваліся ў Менск пешкі, іх затрымалі і даставілі ў РУУС Менскага раёну, дзе склалі пратаколы. На судзе В.Крываль запатрабаваў, каб пасяджэньне вялося па–беларуску. Судзьдзя адхіліў хадайніцтва. Тады прадпрымальнік адмовіўся адказваць на пытаньні. Судзьдзя заявіў аб пераносе працэсу на 27 лютага празь няяўку сьведак.

# Культурны голад

Заля не зьмясьціла ўсіх ахвотных трапіць на прэзэнтацыю кнігі Андрэя Хадановіча.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

7 лютага ў вялікай тэатральнай залі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў прайшла прэзэнтацыя новай кнігі Андрэя Хадановіча «Бэрлібры», што выйшла ў сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва».

Прэзэнтацыя мусіла прайсьці ў Доме літаратара, але за некалькі дзён Хадановічу было адмоўлена ў памяшканьні з фармальнай прычыны. На колькасьць слухачоў зьмена «месца дыслякацыі» не паўплывала: месцаў у залі, разьлічанай на некалькі сотняў чалавек, не хапала. Людзі запоўнілі ўсе праходы ды ўслухоўваліся, прыўзьняўшыся на дыбачкі.

Хадановіч ня проста чытаў вершы — гэта, хутчэй, была мэлядэклямацыя ў суправаджэньні розных творчай манерай музыкаў. Ягоныя выхады чаргаваліся з выступамі калегаў па цэху — Дзьмітрыя Дзьмітрыева, Марыйкі Мартысевіч — больш традыцыйнымі, а таксама адпаведнымі пэрформансамі Віктара Жыбуля і Веры Бурлак.

Замежны госьць, доктар Ульрых Янецкі, прадстаўнік Бэрлінскага Літаратурнага калёквіюму, седзячы на краёчку сцэны, бо месца ў залі не было, толькі дзівіўся, якой папулярнасьцю ў Беларусі карыстаецца паэзія. «Што ж, адсутнасьць свабоды слова мае свае плюсы», — жартаваў у адказ Лявон Баршчэўскі.

**АК**

# Вялікі дзякуй за падтрымку

**Віктару Н.** зь Менскага раёну.

**Сяргею В.** з Баранавіцкага раёну.

**Лявонцію А.** з Полацкага раёну.

**Паўлу С.** з Горацкага раёну.

**Іне С.** з Барысаўскага раёну.

**Генадзю Л.** з Гомелю.

**Іне С., Аляксандру С.** з Горадні.

**Сяргею А.** зь Берасьця.

**Т.Б.** з Магілёва.

**Юр'ю Б.** з Кобрынскага раёну.

**Ганьне П., Алене Б.** зь Віцебску.

**Тамары К.** зь Бешанковіцкага раёну.

**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.

**Паўлу К., А.С., Караліне М., Маргарыце С., Міхаілу Ж., Ігару Б., Альбэрту С., Аляксандру Ф., П.Д., А.В., Тарэсе Р., Ю.Л., Анатолю Л., Б., Алегу Ю., Настасьсі Ж., Алегу Л.** зь Менску

**Франц Сіўко. Дзень Бубна.** — Менск: Логвінаў, 2008. — 276 с.

Замаўляйце кнігі сэрыі

«Кнігарня «Наша Ніва»

праз т.:
**(029) 505-39-11,**
**(029) 126-36-87**

або праз e-mail:
**knihi@me.by**




ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

## Жыве дзіўная Беларусь

**Сёньня хадзіў да доктара. Горла забалела, а на працы прымусілі пайсьці ў паліклініку ўзяць бальнічны ліст.** Куды пайсьці хлопцу зь іншагароднiяй прапіскай, я ня ведаў. Таму пайшоў у першую знаёмую паліклініку. Спадарыня, што мяне сустрэла, падумала, што я паляк, і, можа, таму вырашыла мне дапамагчы: цікавілася ва ўсіх, як мне быць, — чалавеку зь іншагароднiяй прапіскай. Тэрапэўт прыняў мяне без чаргі. Уважліва паглядзеўшы мой пашпарт і, пэўна, усумніўшыся ў беларускай прыналежнасьці, запытала: «А вы паляк?» — «Не, да гэтай краіны аніякага дачыненьня ня маю», — адказаў я, але ў адказ пачуў: «А чаму па-польску размаўляеце?» Давялося тлумачыць, што я карыстаюся роднай мовай, але не дапамагло. Мяне накіравалі ў іншую паліклініку.

Там мяне сустрэла шыльда на дзьвюх мовах, прычым беларуская: «Брэсцкая гарацкая паліклініка №2» была з памылкай. Палічыўшы, што ня варта ўказваць на памылку ў кнізе скаргаў і прапановаў, я пайшоў у прыёмную, адкуль і распачаў шлях па кабінэтах. І хоць я выйшаў з паліклінікі празь дзьве гадзіны, так і не атрымаўшы бюлетэня, але затое ад душы нагаварыўся з нашым мэдпэрсаналам.

**Юрка Бакур, Берасьце**

## Лядовы палац за паўгоду

**Трыццацітысячны горад Бяроза стане наступным населеным пунктам у Берасьцейскай вобласьці, дзе зьявіцца лядовы палац.** Такое рашэньне было прынятае пасьля восеньскага наведваньня Лукашэнкам гэтага гораду. Месцам для будаўніцтва новага палацу стала пляцоўка зь недабудаваным басэйнам яшчэ савецкіх часоў, які паціху развальваўся, і дзе бярозаўскія дзеці, у пошуках прыгод, бавілі вольны час. Цяпер стары недабудаваны аб'ект зносіцца, у бліжэйшы час плянуецца знос і часткі старых жылых хат, каб расчысьціць тэрыторыю пад будаўніцтва. Лукашэнка абяцаў, што пабудуе ў Бярозе і лядовы палац, і новы басэйн, цяпер жа разглядаецца будаўніцтва толькі палацу. Аб'ект плянуюць здаць ужо праз паўгоду да 1 верасьня, але ж мясцовыя жыхары ня вераць, што такое ў іхным горадзе магчымае.

**Павал Белавус, Берасьце**

## Як усё ж звалі Каліноўскага?

**Зьвярнула ўвагу на публікацыю Глеба Лабадзенкі «Кастуся Калиновского на самом деле звали Викентием» у «Комсомольской правде в Беларуси», падрыхтаваную паводле гутаркі з гісторыкам Анатолем Грыцкевічам.** Там шаноўны прафэсар сьцьвярджае, што сярод беларускай шляхты не было заведзена выкарыстоўваць другое імя, і наш герой (поўнае імя Каліноўскага — Вінцэнт Канстанцін) «заўсёды сябе называў і падпісваўся Вікенціем Каліноўскім». Сапраўды, пад афіцыйнымі дакумэнтамі ён ***падпісваўся*** так, як яго назвалі бацькі і як зарэгістравалі, калі хрысьцілі. А вось як ён сябе ***называў***, паспрабуем разабрацца. Гляджу зборнік матэрыялаў і дакумэнтаў, падрыхтаваных літоўскімі і беларускімі навукоўцамі да 100-годзьдзя паўстаньня 1863 г. Там паўсюль фігуруе другое імя Каліноўскага — ***Канстанцін***. Так яго называлі і ягоныя паплечнікі (Ільдэфонс Мілевіч, Язэп Каліноўскі, Станіслаў Ажэшка, Франц Канаплянскі), і расейскія ўлады. Толькі Язэп Ямант ужыў ініцыялы ***В.-К.***, а крыху ніжэй, у гэтых жа паказаньнях, ***К.*** і ***В.*** А вось Франц Канаплянскі засьведчыў пэўна: «Господин этот, ***назвавшийся*** Константином (впоследствии я узнал, что он Калиновский), вручил мне…» Канстанцінам пасьлядоўна называе Каліноўскага і першы гісторык паўстаньня Аскар Авэйдэ, знаёмы зь ім яшчэ з часу навучаньня ў Пецярбурскім унівэрсытэце.

Такім чынам, спадар Анатоль Грыцкевіч ня мае рацыі: Каліноўскі, бясспрэчна, карыстаўся ў жыцьці другім сваім імем. Калі б было інакш, сябры і паплечнікі ня звалі б яго Канстанцінам. Відаць, «правіла першага імя» не было абсалютным. Другім імем карыстаўся, напрыклад, і Андрэй Тадэвуш Банавэнтура Касьцюшка.

Думаю, у тым, што Каліноўскі звычайна не ўжываў першага імя, быў і практычны сэнс: яно сугучнае, асабліва ў расейскай форме, зь імем старэйшага брата (Викентий — Виктор), зь якім яны ў сталым узросьце, ад 1855 г., жылі разам — спачатку ў Маскве, а потым у Пецярбургу.

**Аксеня Гаўрук, Менск**

## Набор выкладчыкаў для стварэньня праграмы бізнэс-адукацыі ЭГУ

**Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт (ЭГУ, Вільня) на конкурснай аснове праводзіць набор выкладчыкаў для ўдзелу ў праекце па стварэньні праграмы бізнэс-адукацыі разам з унівэрсытэтам Лімэрыка (Ірляндыя).** Для ўдзелу ў конкурсе трэба даслаць CV на ангельскай мове (гл. форму: http://www.ehu.lt) на адрас mbaproject@ehu.lt да 15 лютага 2008 г. Падрабязная абвестка ёсьць на http://svetlahorsk.belarda.org/info/abviestki/

# ВОДГУК

## Да пытаньня пра нацыянальную годнасьць

**У «НН» №2'2008 было перадрукаванае інтэрвію ксяндза з Рэчыцы Гжэгажа Худака, якое ён у траўні даў карэспандэнтцы польскай газэты Tygodnik wschodni.** Сьцьвярджалася, што яно каштавала кс. Гжэгажу месца ў Беларусі. У інтэрвію зьмяшчаліся даволі рэзкія характарыстыкі маральнага стану ў нашай краіне, у прыватнасьці — у Рэчыцы. Рэчыца — мой родны горад, з кс. Худакам я знаёмы асабіста і быў непасрэдным удзельнікам тых падзей, пра якія ён выказваўся.

Прычынай таго, што нашыя ўлады не працягнулі кс. Гжэгаж дазвол працаваць у Беларусі, было не інтэрвію. Яно было толькі нагодай, а прычына — у падзеях, якія суправаджалі вяртаньне будынка касьцёла ў Рэчыцы і пра якія сказана ў інтэрвію.

Бабулек травілі газам непасрэдна ў касьцёле. І ўсе яны — грамадзянкі Беларусі сталога веку. Выпадак з газам паскорыў рашэньне праблемы. Але калі ўжо вярнулі храм, я прапаноўваў кс. Гжэгажу ўзьняць скандал наконт ужываньня газу і тлумачыў, што ўлады гэтай сваёй паразы не забудуць і трэба пачаць абараняцца ўжо цяпер. Але кс. Гжэгаж хацеў наладзіць добрыя стасункі з кіраўніцтвам гораду, дзе будзе служыць. А дарма.

Што тычыцца надрукаваных выказваньняў. Гэта не было інтэрвію. Была прыватная размова, на друкаваньне якой кс. Гжэгаж ніколі дазволу ня даў бы. А маладая польская журналістка размову надрукавала, і яшчэ ў адпаведнай інтэрпрэтацыі. Калі пра гэта даведаўся кс. Гжэгаж, ён адразу ж патэлефанаваў у газэту і запатрабаваў надрукаваць зьняпраўджаньне. У выніку ў Tygodniku wschodnim зьявіўся станоўчы артыкул пра Беларусь, але зьняпраўджаньня газэта не дала. А ў суд кс. Гжэгаш праз сваё сьвятарскае становішча падаць ня змог. Ён пайшоў у Рэчыцкі гарвыканкам і папрасіў прабачэньня за тое, што было надрукаванае. Але ўлады ўсё адно не дазволілі працаваць у Беларусі. За кароткі час вернікі Рэчыцы і Гомелю сабралі некалькі сотняў подпісаў пад просьбай да ўладаў, каб яго пакінулі. Думаю, што, у рэшце рэшт, ксяндза змаглі б адстаяць. Але касьцёльныя ўлады, напэўна, ня хочучы абвастрэньня, вырашылі інакш. Кс. Худак пакінуў Беларусь, а на яго месца прыехаў кс. Яцак Борвец, таксама паляк.

Хачу таксама выказацца наконт таго, як кс. Гжэгаж ахарактарызаваў нашу сытуацыю. Мне ягоная характарыстыка непрыемная. Непрыемна, што так пра нас кажа грамадзянін іншай дзяржавы, але значна больш непрыемна тое, што шмат у чым гэта праўда.

Ненармальны наш «Закон аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях», у якім, фактычна, вернікі падзяляюцца на людзей першага гатунку (праваслаўныя), другога гатунку (каталікі, юдэі, мусульмане і лютэране) і ўсіх астатніх, без усялякага гатунку (перш за ўсё гэта неапратэстанты).

Ненармальнае і стаўленьне да людзей, якое дэманструюць нашы ўлады, і ненармальна, што больш шасьць з такім стаўленьнем пагаджаецца.

**Віктар Адзіночанка, Гомель**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Выбар генэрала

Авантурыст, таленавіты тактык партызанскай вайны, генэрал розных арміяў — спрэчкі вакол ягоных асобы і дзейнасьці ня сьціхнуць яшчэ доўга. 10 лютага споўнілася 125 гадоў з дня народзінаў Станіслава Булак-Балаховіча. Піша **Алег Дзярновіч**.



Ён мог бы стаць расейскім героем першай усясьветнай вайны — зрэшты, і стаў, пачаўшы службу ніжнім чынам і меўшы ў 1917 г. ужо ранг паручніка, атрымаўшы Георгіеўскі крыж, тры ступені і тры ордэны Сьв.Ганны. Ён мог стаць героем антыбальшавіцкага расейскага супраціву — зрэшты, і стаў, прывёўшы 2 лістапада 1918 г., яшчэ ротмістрам, два дывізіёны (каля 800 шабель) ад «чырвоных» у Пскоўскі корпус «белых». У чэрвені 1919 г. ён атрымаў ранг палкоўніка, а ў ліпені 1919 г. на прапанову генэрал-лейтэнанта Арсеньнева камандуючы Паўночна-Заходняй арміяй генэрал-лейтэнант Радзянка надаў Станіславу Булак-Балаховічу ранг **генэрал-маёра** за пасьпяховае вызваленьне ад бальшавікоў Пскова. Пэўна, заслужаны ён перад Эстоніяй і Латвіяй, бо ягоныя часьці ўжо як Асобныя аддзелы БНР у Балтыі ў канцы 1919 — пачатку 1920 г. займалі пазыцыі пад Ізборскам на антыбальшавіцкім фронце паміж эстонскай і латыскай арміямі. Перамовы ўрадаў Эстоніі і Латвіі з Савецкай Расеяй зрабілі непажаданым знаходжаньне ўзброеных аддзелаў Булак-Балаховіча ў Балтыі.

Так некалі і з камандаваньнем «белага» руху на паўночным захадзе ў яго не склаліся адносіны, нягледзячы на пасьпяховыя вайсковыя апэрацыі. Балаховіч зь юнацтва быў блізкі да эсэраў. Галоўнакамандуючы ж Паўночна-Заходняй арміяй **генэрал ад інфантэрыі** Мікалай Юдзеніч, хоць і сам меў беларускае паходжаньне, але цьвёрда стаяў на прынцыпах расейскага манархізму і адмаўляў права «іншародцам» на самастойнае існаваньне. Гатоўнасьць Балаховіча да службы ў беларускім войску, безумоўна, паўплывала на яго адхіленьне ў канцы 1919 г., паводле загаду Юдзеніча, ад камандаваньня корпусам. Ужо ў ноч на **28 студзеня 1920 г.** Балаховіч сам арыштаваў **Юдзеніча**.

Афіцыйную дэклярацыю пра беларускае грамадзянства і просьбу прыняць яго на беларускую службу генэрал склаў 14 лістапада 1919 г. Яшчэ раней, у кастрычніку 1919 году, падчас канфэрэнцыі балтыйскіх краінаў, Украіны і Беларусі ў эстонскім Тарту на прапанову шэфа Беларускай Вайскова-Дыплямалтычнай Місіі палкоўніка Кастуся Езавітава перайсьці на службу БНР Балаховіч адказаў, што ідэя барацьбы за незалежнасьць Беларусі для яго значна бліжэй, чым удзел у акцыях «белых» генэралаў.

Вельмі цяжка сачыць за календаром падзеяў у 1917—1920 гг. — настолькі імкліва тады зьмянялася ваенная і палітычная сытуацыя, абвяшчаліся цэлыя дзяржавы ды зьнікалі ўрады. Праект БНР у гэтых варунках выглядаў вельмі няпэўна — ён меў такога адназначнага ворага, як бальшавіцкая Расея; яму не магла спрыяць ні кайзэрская, ні рэспубліканская Нямеччына, што мела абавязкі перад чырвоным Крамлём; на яго вельмі падазрона глядзелі краіны Антанты, бо сваім фактам існаваньня БНР нібы парушала з расейскага боку антынямецкі фронт хаўрусьнікаў (хіба толькі амэрыканская місія, яшчэ падчас знаходжаньня корпусу Балаховіча ў Балтыі, перадала яму вайсковы шпіталь і мэдыкамэнты). Беларускую карту маглі разыграць толькі Пілсудзкі і літоўскі ўрад у Коўне. У такім выпадку прыняцьце боку БНР было сапраўдным выбарам. Сярод мора хаосу, у які ператварылася Ўсходняя Эўропа і ўся Расея, выбар свайго апірышча, сваёй мэты дазваляў ратавацца — не пераўтварыцца проста ва ўзброены кантынгент, якому патрэбныя сродкі выжываньня, і ня стаць усяго толькі камандай вайсковых наймітаў, попыт на якія рэзка ўзрос.

У 1920 г. у Балаховіча будуць яшчэ хаўрус з Барысам Савінкавым і Палескі паход. 7 лістапада 1920 г. у Тураве адбылася ўрачыстасьць пераняцьця Беларускім Палітычным Камітэтам з рук генэрала Булак-Балаховіча цывільнай улады «над вызваленай зямлёй Беларускай Народнай Рэспублікі». На тураўскім рынку сталі ў шыхтах беларускія атрады. На ўрачыстасьць зьехалася шмат жыхароў навакольных вёсак і прысутнічалі дэлегацыі хрысьціянскага і габрэйскага насельніцтва. Прыехаў таксама Барыс Савінкаў. Пасьля багаслужбы, падчас якой былі ўзьнесеныя малітвы за БНР і посьпех яе зброі, Булак-Балаховіч прысягнуў на нацыянальным сьцягу, што «не складзе зброі, пакуль ня вызваліць роднага краю ад узурпатараў». Калі ўжо 12 лістапада Булак-Балаховіч прыбыў у Мазыр, ва ўсім горадзе з гэтай нагоды былі вывешаныя бел-чырвона-белыя сьцягі.

Як адзначаюць гісторыкі, не кранаючы чыста мілітарных аспэктаў, паход генэрала Булак-Балаховіча меў адзін вельмі важны вынік. У Асобным беларускім аддзеле Балаховіча з 1919 г. служылі ўраджэнцы роднай генэралу Дзісеншчыны і Дзьвіншчыны. Падчас баёў на заходнім Палесьсі летам 1920 г. да Беларускай Народнай Арміі, як тады называўся аддзел генэрала Булак-Балаховіча, сталі далучацца палешукі. У час фармаваньня арміі ў Тураў прыйшлі атрады зь Беластоку, Слуцку і Менску. У Мазыры далучыліся мясцовыя добраахвотнікі. Такім чынам, армія набыла агульнанацыянальны характар. Дзякуючы намаганьням беларускіх жаўнераў, усходняе Палесьсе таксама было далучана да гісторыі змаганьня за незалежную Беларускую Народную Рэспубліку.

Як бы мы ні ацэньвалі важнасьць індывідуальнага разьвіцьця, самадастатковасьці і ўласнай адказнасьці, сучасная арганізацыя грамадства патрабуе, каб чалавек і народы мелі ўласную дзяржаву. Асаблівая безабароннасьць індывіда робіцца адчувальнай у крызісныя пэрыяды. Генэрал Булак-Балаховіч імкнуўся служыць дзяржаве, шукаў яе, спрабаваў стварыць. Гэтыя пошукі і спараджаюць поле для дыскусіі пра ягоную асобу. Але мы ведаем, што свой выбар ён зрабіў.

# Апошні пазытывіст

Пра гісторыка Георгія Галенчанку піша **Алег Дзярновіч**.

## Выбар

Кажучы пра залежнасьць гісторыкаў ад сацыяльна-палітычнага навакольля, ня варта забывацца, што дасьледчык заўжды мае пэўную ступень унутранай творчай аўтаноміі. Наколькі ён рэалізуе гэта ў сваёй дзейнасьці, залежыць ад моцы характару, навуковага тэмпэрамэнту, адэкватнасьці сьветаадчуваньня, жыцьцёвых прынцыпаў. Вось жа тэхнічныя і сацыяльныя праблемы ўзьнікаюць заўжды і ў кожнага.

Хоць Георгі Галенчанка ня мае ў сваім радаводзе этнічных беларускіх каранёў, ён зьяўляецца адным з самых выдатных сучасных гісторыкаў, які шмат зрабіў для разьвіцьця нацыянальнай культуры і гуманістыкі. Калі я запытаўся ў спадара Георгія, што значыць для яго беларуская мова ў нашай сытуацыі, то ён адказаў, што адчувае асабістую адказнасьць за культуру і, у пэўным сэнсе, крыўду за стан мовы.

Георгі Галенчанка нарадзіўся 28 лютага 1937 г. у Петразаводзку ў сям'і выкладчыкаў мясцовага, тады яшчэ Карэла-Фінскага, унівэрсытэту. Ягоны бацька Якаў паходзіў з украінскамоўнага бранскага казацтва — таму, паводле савецкай пашпартнай сыстэмы, Георгі быў запісаны ўкраінцам. Дзед жа, Пракоп Галенчанка, служыў у корпусе жандараў. І толькі пераездамі сям'і ўдалося закамуфляваць гэты факт перад савецкай уладай. Пасьля вайны, у лістападзе 1945 г., франтавік Якаў Галенчанка атрымаў прызначэньне на пасаду выкладчыка ў Менскім пэдынстытуце. З таго часу ўсё сьвядомае жыцьцё Георгія Галенчанкі павязанае зь Беларусьсю.

Ягоны дыплёмны праект быў прысьвечаны беларускаму кірылічнаму кнігадрукаваньню. Кнігазнаўчая тэматыка застанецца адною з галоўных у дасьледаваньнях Г. Галенчанкі. Першы бібліяграфічны сьпіс беларускіх старадрукаў XVI—XVIII стст. быў апублікаваны ім ужо ў 1961 г. Ужо ў 1965 годзе пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН СССР А. Сідарава гісторык зь Менску абараніў кандыдацкую дысэртацыю «Гісторыя беларускага кнігадрукаваньня XVI—XVIII стст. (кірылаўскага)».

## Кніжная галяктыка

Усе гэтыя нарыхтоўкі знайшлі сваю лягічную завершанасьць у зводным каталёгу «*Кніга Беларусі 1517—1917*» (1986), дзе Георгі Галенчанка падрыхтаваў разьдзел «Старадрукаваныя кірылічныя выданьні XVI—XVIII ст.» Дасьледаваньне прадугледжвала пошук старадрукаў і іх падрабязнае бібліяграфічнае апісаньне. Такіх выданьняў удалося выявіць звыш 400 — гэтым самым была паказаная прастора кірылічнага пісьменства Беларусі ў тыя часы. Падаў ён і аналіз зьместу старадрукаў. Прыгадаем, што гэта пераважна былі кнігі рэлігійнага зьместу, і не забудземся, што ў тыя гады савецкая ўлада яшчэ не пачала палітыку лібэралізацыі стасункаў з царквой. Апісаньне зьместу беларускіх літургічных выданьняў дазволіла маскоўскім дасьледчыкам дзейнічаць такім жа чынам пры выданьні каталёгаў расейскіх старадрукаў — дзякуючы створанаму прэцэдэнту.



Кнігазнаўчай тэматыкай Георгі Галенчанка працягваў займацца ўжо ў Інстытуце гісторыі АН БССР, куды патрапіў у 1968 г. Лаўрэн Абэцэдарскі не пажадаў узяць уласнага дыплёмніка да сябе на катэдру гісторыі Беларусі. У выніку ў Інстытуце ўзмацніўся напрамак дасьледаваньня гісторыі культуры. Да гэтага ж манапольнай тэматыкай у Інстытуце была сацыяльна-эканамічная тэматыка ў рамачным, вузка марксісцкім яе разуменьні.

## Імя Скарыны

З зацікаўленьня гісторыяй кнігі вынікала асаблівая ўвага да асобы і выданьняў Францыска Скарыны. Манаграфія «*Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар*» (1993) была падсумаваньнем тэмы. Яна стала падставай для доктарскай дысэртацыі, абароненай у ліпені 1999 г. Выдадзеная ЮНЭСКА на францускай і ангельскай мовах кніга «Францыск Скарына» ў суаўтарстве В.Чамярыцкага, Г.Галенчанкі і В.Шматава паспрыяла пашырэньню ў сьвеце зьвестак пра першадрукара і Беларусь.

Але сам дасьледчык найбольш высока ацэньвае свой удзел у якасьці навуковага кансультанта і ўкладальніка ў падрыхтоўцы ўзнаўленьня *Бібліі* Скарыны. Тэрмін «Факсымільнае ўзнаўленьне» не зусім дакладна адлюстроўвае спэцыфіку працы над выданьнем. Да нас дайшло 432 асобнікі і фрагмэнты скарынаўскіх выданьняў, аднак мы ня маем ніводнага поўнага камплекту. Каб выдаць *Біблію*, спатрэбілася сабраць узорны, поўны камплект з выданьняў і аркушаў у розных кнігазборах. Дзеля гэтага давялося аб'езьдзіць бібліятэкі розных краінаў. Георгія Галенчанку ў гэтых падарожжах суправаджаў фатограф Менскай фабрыкі каляровага друку,

**З друку выходзіць зборнік навуковых працаў «Silva rerum nova: Штудыі ў гонар 70-годзьдзя Георгія Галенчанкі». Шукайце ў кнігарнях.**

які здымаў выяўленыя асобнікі ці аркушы выданьняў.

Адметна, што ў фінансаваньні выданьня ўдзельнічала Праваслаўная Царква, якая заўжды стрымана ставілася да дзейнасьці Скарыны — ягоныя выданьні былі для Царквы занадта экумэністычнымі і сьвецкімі. Да таго ж, у сваё выданьне Скарына ўключыў кнігі, якія не ўваходзілі ў праваслаўны Біблійны канон, напрыклад, Кніга «*Ісус Сірахаў*». Удзел Царквы ў перавыданьні *Бібліі* Скарыны — знак таго, што тое адбывалася ў гады спробаў адбудовы беларускага кансэнсусу.

Апроч таго, Георгі Галенчанка ня проста пацьвердзіў здагадку польскага гісторыка Генрыка Лаўмяньскага пра артаграфічную памылку, ад чаго і пайшла палітызаваная традыцыя называць Скарыну Георгіем. Беларускі гісторык выявіў у пазнанскім архіве і абнародаваў дакумэнт, які павінен быў спыніць дыскусіі. Ключавым тут стала лацінскае слова egregius (выдатны), ужытае ў дачыненьні да доктара Скарыны — падчас капіраваньня з арыгіналу канцылярыст памыліўся і перапісаў egregius як georgius.

## Станавая культура як непажаданая

З часам зьявілася новая тэма дасьледаваньняў — духоўная культура Беларусі XVI—XVII стст. Галенчанка пісаў менавіта пра культуру прафэсійную і высокую, а гэта ў значнай ступені была культура саслоўная і, перш за ўсё, культура прывілеяваных станаў. Ягоная кніга «*Очерки духовной культуры Белоруссии второй половины XVI — первой половины XVII в.*» мелася выйсьці ў 1981 г. у выдавецтве «Навука і тэхніка». Пішу мелася, бо зроблены ўжо друкарскі набор кнігі быў рассыпаны на загад зьверху. У ананімнай рэцэнзіі ў выдавецтва сьцьвярджалася, што аўтар уздымае шляхецкую культуру, у той час як трэба больш асьвятляць культуру працоўных масаў. Польшчу ж дасьледчык называў адным з цэнтрам эўрапейскае культуры. У часы «Салідарнасьці» гэта было занадта.

Георгі Галенчанка ж, тады яшчэ аўтамабіліст, вяртаючыся з выдавецтва ўсхваляваным, ледзь ня трапіў у аварыю. Лёс ратаваў, але кніжку захаваць не ўдалося. Хаця два асобнікі ўсё ж засталіся на руках, што дае падставы аўтару ўключаць кнігу ў сваю бібліяграфію.

Большасьць сабранага ў кнізе матэрыялу так і не была апублікаваная, за выняткам асобных сюжэтаў. Забарона ж кнігі Г. Галенчанкі на дзесяцігодзьдзе затармазіла працэс дасьледаваньняў шляхецкай і прафэсійнай культуры Беларусі XVI—XVII стст.

Да несумненных дасягненьняў Георгія Галенчанкі трэба аднесьці выяўленьне шэрагу найцікавейшых крыніцаў, у тым ліку альбому пачынальніка барока ў ВКЛ дойліда Яна Марыі Бэрнардоні, што раскрыла нам архітэктурна-мастацкаю праграму Ордэну езуітаў у Рэчы Паспалітай. Вельмі плённым стала супрацоўніцтва зь нямецкімі славістамі — так зьявіліся выданьні факсымільнага тыпу «*Апостала*» Скарыны, і «*Эвангельля*» Васіля Цяпінскага, дзе Г. Галенчанка быў укладальнікам.




**Галоўны фасад Нясьвіскага замку. Малюнак з «Альбому Бэрнардоні», знойдзенага Г. Галенчанкам.**

## Самаабмежаваньні пазытывіста

Георгі Галенчанка — клясычны навуковец. Яго цікавіць уласна дасьледаваньне. Папулярызацыя і выкладаньне прыцягваюць яго значна менш. Але грамадзтва зацікаўленае ў адаптаваных выніках працы навукоўцаў. У 1990-я Г. Галенчанка, на заклікі калегаў і тагачаснай дырэкцыі Інстыту ту гісторыі, далучыўся да стварэньня падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Найбольш праблемным у напісаньні навучальнай літаратуры зьяўляецца тое, што тут, у першую чаргу, патрабуюцца лінейныя, у пэўным сэнсе адназначныя ацэнкі — гэта прафэсійнаму гісторыку заўжды складана рабіць.

Г. Галенчанка зьяўляецца гісторыкам зь вельмі выразным аўтарскім почыркам, ён мае акрэсьленыя схільнасьці да пазытывісцкіх падыходаў у любой з тэмаў дасьледаваньня. Таму ён можа быць шанаваным, але не да канца прынятым усялякай жорстка сканструяванай ідэалягічнай сыстэмай. Пазытывізм жа Г. Галенчанкі грунтуецца на адным прынцыпе: да любой тэмы — праз крыніцы.

Мэтадалягічная ўстаноўка пазытывізму накіраваная на тое, што пазытыўную веду можна атрымаць толькі ў выніку ўласна навуковага, а не абстрактна-тэарэтычнага пазнаньня. Разглядаючы розныя чыньнікі гістарычнага працэсу, пазытывізм стымулюе пошук новых крыніцаў і іх публікацыю. Гісторык-пазытывіст сам накладае на сябе забарону ўносіць у вывучэньне мінулага элемэнты ацэнкі з пазыцыі сёньняшняга дня; ён накладае на сябе абавязак цалкам «адключыць» свае палітычныя перакананьні. Пазытывізм жа абвінавачваюць у пэўнай абмежаванасьці, «нятворчым» разуменьні гісторыі. Дакараюць і ў тым, што яго гістарыяграфія пазьбягае аналізу шырокіх праблемаў, а скіроўвае намаганьні на пошук і дэталёвае апісаньне фактаў. Беларуская гістарыяграфія так і не перажыла плённага пэрыяду пазытывізму. І Георгі Галенчанка захоўвае вернасьць гэтаму кірунку, які ратаваў частку гісторыкаў у часы вульгарнага марксізму, а таксама не дазваляе падмануцца ў эпохі сурагатных ідэалёгіяў.



# Юры Сьлесарук: «Калі ідзе дождж, мы закрываем раскоп плёнкай»

Гутарка з загадчыкам унікальнага археалягічнага музэю «Берасьце».

**Наталка Бабіна: Каштоўнасьць музэю «Берасьце» вельмі высокая, і ёнварты большага, чым быць нейкім дадаткам да комплексу «Брэсцкая крэпасьць-герой», як гэта (на маю думку) ёсьць цяпер. Чым цяпер жыве музэй? Ці многа вы прымаеце наведвальнікаў?**

**Юры Сьлесарук:** У мінулым годзе было 44 тысячы. Прычым музэй працяглы час быў зачынены: мы праводзілі кансэрвацыю і іншыя працы ў раскопе, ладзілі дах. Працы ў раскопе насьпелі даўно.

Калі музэй будавалі, гэта быў самы танны варыянт. Тут вялікія перапады тэмпэратуры: зімой яна можа быць мінусавай, а летам — даходзіць да 30 градусаў гарачыні. Ні да чога добрага гэта не прыводзіць. Тут недастаткова вэнтыляцыі. Але куды падзенесься? Даводзіцца неяк прыстасоўвацца.

Вялікая праблема была з дахам, які працякаў. У нас даўно скончыўся шклопрафіліт, якім мы ўшчыльнялі стыкі. Цяпер шкляная частка даху замененая на шклопакеты. Але неабходна рамантаваць бляшаную частку страхі, бо яна ўсё ж працякае. Рамонт працягнецца вясной. Пэрыядычна мы закрываем раскоп плёнкай: калі ідзе дождж, калі праходзяць працы на даху і адтуль сыплецца друз.

Наведнікаў часта зьдзіўляе тое, што ў раскопе растуць зялёныя расьліны, мох. Спачатку мы выкарыстоўвалі гербіцыды,

каб пазбавіцца ад іх, але потым вырашылі, што рабіць гэтага ня варта. Шкоды пабудовам яны не наносяць. Пэрыядычна, прыкладна раз у два тыдні, мы іх проста выполваем. У раскоп заўсёды прасочваецца з грунту вада, якую мы адпампоўваем, і на вільготнай глебе зьяўляюцца расьліны.

**НБ: Ці ёсьць у вас лябараторыя, дзе удасканальваюцца спосабы кансэрвацыі старажытных пабудоваў?**

**ЮС:** Тэхналёгія кансэрвацыі распрацаваная ў Беларускім тэхналягічным унівэрсытэце. Мы супрацоўнічаем зь ім з самага пачатку. Яны прапануюць нам розныя мэтады: спачатку кансэрвацыя праводзілася фэнолавымі сьпіртамі, затым — клеем і смоламі, а вось цяпер кансэрвацыя праводзілася спэцыяльным вогнебіяабарончым прэпаратам «Спад». У нас падпісанае пагадненьне з унівэрсытэтам пра назіраньне за станам пабудоваў. Калі спатрэбіцца, кансэрвацыя будзе паўтораная, але, хутчэй за ўсё, ужо нейкім іншым прэпаратам. Мы пастаянна адсочваем гэта: у якім стане знадворны слой, у якім стане стрыжань, як «пачуваюць» сябе ніжнія вянкі, як верхнія...

Усе старажытныя пабудовы ляжаць на каменных бардзюрах і затым на новых дубовых бэльках, набрынялых антысэптычным расстворам. Паміж пабудовамі і грунтам, такім чынам, ёсьць адлегласьць на 35—40 см.

**НБ: Ці задаволеныя вы ўзроўнем фінансаваньня музэю?**

**ЮС:** Летась нам выдаткавалі досыць вялікія сродкі. Але хацелася б, каб фінансаваньне было больш раўнамерным, бо тыя праблемы, якія мы вырашалі летась і працягваем вырашаць цяпер, сьпелі і назапашваліся даўно.

**НБ: Ці вядзецца ў музэі навуковая дзейнасьць?**

**ЮС:** Так. У нас больш за 42 тысячы прадметаў з раскопак, якія трэба апісаць. Супрацоўнікі вядуць кансэрвацыю, пішуць навуковыя пашпарты, заносяць дадзеныя ў электронны каталёг. Вось, скажам, супрацоўнік, які займаецца скурамі, летась скончыў апісаньне поршняў, цяпер перайшоў на туфлі. Я займаюся жалезаапрацоўкай і нумізматыкай. Ну і, канечне, супрацоўнікі вядуць асьветніцкую працу, праводзяць экскурсіі, ладзяць выставы.

**НБ: А які заробак у супрацоўнікаў?**

**ЮС:** Ад 320 да 370 тысяч. Мой заробак — каля 600 тысяч.

**НБ: Пры многіх музэях сьвету існуюць музэйшопы: крамы, дзе наведнікі могуць набыць копіі рэчаў, выстаўленых у музэі...**

**ЮС:** У нас працуюць два прадпрымальнікі, якія гандлююць кніжнай і сувэнірнай прадукцыяй. Асартымэнт — цалкам на іхны густ. Магчыма, было б добра, каб гэтай працай займаўся сам музэй, але на гэта трэба браць ліцэнзію, шукаць для гэтай мэты людзей. Раней у краязнаўчым музэі мы займаліся такой справай, але ў фінансавым пляне гэта аказалася для музэю стратным.

**НБ: Сярод берасьцейскай інтэлігенцыі карыстаецца папулярнасьцю ідэя ўзнаўленьня хаця б часткі гораду XVI—XVII стагодзьдзя, часоў яго росквіту, з усімі тымі цэрквамі, кляштарамі, іншымі будынкамі, ад якіх, на жаль, нічога не засталося ў сучасным Берасьці. Як Вы ставіцеся да гэтай ідэі? І дзе, на Ваш погляд, можна было б узьвесьці такі комплекс, каб ён стаў своеасаблівым працягам старажытнага Берасьця, што дэманструецца ў археалягічным музэі, і даваў наведвальнікам уяўленьне пра разьвіцьцё гораду ў гісторыі?**

**ЮС:** Па-мойму, трэба пачынаць з манастыра бэрнардынак, які стаіць вось паблізу ад нас, на Шпітальным востраве. Што датычыць Цэнтральнага вострава, то я лічу, што пабудовы крэпасьці зносіць ня трэба. Што ёсьць, тое ёсьць. Я цалкам разумею, што многія хацелі б бачыць на гэтым месцы стары горад, які быў сапраўды прыгожым і цікавым. Але ж трэба ўлічваць рэаліі. Ёсьць крэпасьць — і хай яна будзе. На пустых месцах, якіх у крэпасьці многа, цалкам магчыма ўзнавіць нейкія цікавыя будынкі — прычым тамсама, дзе яны стаялі. Гэта будзе нават цікавей: сумясьціць крэпасьць з помнікамі XVI—XVII стагодзьдзяў. Іншая справа, што там знойдуць пры раскопках, ці будзе што ўзнаўляць...

**НБ: Раскажыце трошкі пра сябе і пра тое, якія галоўныя задачы Вы бачыце перад музэем.**

**ЮС:** Я берасьцеец. Школьнікам працаваў тут на раскопках. Вучыўся ў нашым пэдынстытуце. Працаваў у краязнаўчым музэі на розных пасадах. Асноўная задача: зрабіць так, каб музэй быў цікавым для наведвальнікаў. Зрэшты, такая мэта ў любога музэю.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Беларус 2007. Літаратурны альманах беларускіх пісьменьнікаў замежжа. — Нью-Ёрк: Выдавецтва газэты «Беларус», — 2007**

У альманаху сабраныя творы людзей, якія пішуць па-беларуску, жывучы за межамі Беларусі. Цікавыя, чытальныя, сьвежыя рэчы.

**Кудравец А. За дальнім прычалам. Літаратурныя партрэты. — Менск: «Медысонт», 2007. — 224с. — (Бібліятэчка часопісу «Дзеяслоў» — вып. 4).**

У новую кнігу вядомага пісьменьніка ўвайшлі літаратурныя партрэты беларускіх пісьменьнікаў: Адамовіча, Брыля, Быкава, Мележа, Караткевіча ды інш.

**Мінкін. А. Пэнаты: паэзія. — Менск: «Логвінаў», 2007. — 146 с. — (Галерэя «Б»).**

Цудоўныя вершы.

**Хто ёсьць хто ў Беларусі / Укладальнікі: Андросік, Голубеў, Забродская, Івуць, Кулажанка, Трыгубовіч, Фядута, Чуйко. — Вільня, 2007. — 256 с.**

Даведнік утрымлівае каля 500 каротких біяграфій людзей, што актыўна ўплываюць на грамадзка-палітычнае жыцьцё Беларусі.

**Annus albaruthenicus 2008 — Год беларускі 2008. Дзявяты том. Рэдактар С.Яновіч. — Крынкі, 2008. — 262 с.**

У альманаху — навуковыя і мастацкія творы, датычныя Беларусі, на польскай, беларускай, ангельскай, нямецкай, вугорскай мовах.

**Pępek nieba. Antologia młodej poezji białoruskiej. — Wrocław: Kolegium Europy Wschodniej, 2006. — 216 с.**

У густоўна аформленай кнізе сабраныя вершы маладых беларускіх паэтаў у двух варыянтах — у арыгінале і ў перакладзе на польскую.

**НБ**



# Мір

Здымкі Ірыны Мірскай.











# Філязофія флікераў

Ня надта падзяляю аптымізму наконт таго, што пагалоўнае нашэньне флікераў дапаможа грамадзтву, як мінімум, навесьці парадак на дарогах. Кіраўнік МУС абсалютна не разумее культурнай падкладкі падобных фішак у аўтарытарных грамадзтвах. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

У Пхеньяне (Паўночная Карэя) давялося сутыкнуцца зь цікавым фэномэнам. Зь дзесяці гадоў кожны атрымлівае значак з выявай Кім Ір Сэна. Латунны выраб ён мае насіць на грудзях і днём і ўначы да канца жыцьця . Аднак дзеці з элітных школаў цэнтральнага раёну сталіцы носяць значкі з Кім Ір Сэнам на самым кончыку каўнерыка кашулі. Такім чынам, элітны маладняк дае зразумець, хто тут каралі жыцьця.

Увогуле, як кажуць мясцовыя, кожны раён носіць значак па-свойму — знак прыналежнасьці да свайго кварталу. Шчыра кажучы, баюся падобных эксцэсаў у Беларусі.

Сцэна ў мэтро.

**Дыктар:** Наступная станцыя — «Трактарны завод».

**Адзін пасажыр-тынэйджар другому:** Давай хутчэй нацягвай флікер на шыю. Гэта галоўная фішка мясцовых, іначай канкрэтна адграбём у рыла.

**Дыктар:** Наступная станцыя — «Аўтазаводзкая».

**Адзін пасажыр-тынэйджар другому:** Хуценька здымай флікер з шыі і вяжы праз левае вока, як у кіно ў таго пірата. Гэта галоўная фішка тарпэдонаў, іначай канкрэтна адграбём у рыла. Блін, позна…

Тым больш постсавецкае грамадзтва падзеленае ня толькі паводле прынцыпу кварталаў, аднак і паводле палітычных забабонаў. Ужо асабіста бачыў флікеры, якія выпусьціў рух Мілінкевіча. Мяркую, што іншыя палітычныя фармацыі падхопяць моду.

Страшна ўявіць — што будзе.

Сцэна на трасе.

**Пасажыр шафёру:** Глядзі, Вася, сябра БРСМ прэцца. Па флікеры бачу. А ну-ка, давай яго да плоту прыпячатаем.

Вера ў флікеры ў агітках ведамства Навумава настолькі моцная, што першы выпадак аварыі з удзелам уладальніка флікера можа выклікаць крызіс грамадзкай думкі, кшталту сытуацыі, якая назіраецца ў сьвядомасьці дзяцей, калі ім даводзяць, што Дзеда Мароза няма. Міліцыянэрам давядзецца добра папрацаваць, каб схаваць канцы ў ваду.

Сцэна ў пастарунку МУС.

**Сьледчы:** Ну, расказвайце, як была справа?

**Злачынца:** Я, значыць, еду, а там бачу — чувак з флікерам. Я пачаў быў тармазіць — ды позна.

**Сьледчы:** Значыць, флікер вы бачылі, аднак чалавека пераехалі?

**Злачынца:** А што, калі мы зможам дагаварыцца…ой, за што вы мяне б’еце?

**Сьледчы:** Пішы, гад: я — імя, прозьвішча — прызнаюся, што зь дзяцінства зьяўляюся інвалідам зроку, абсалютна сьляпым, як Сьціві Ўандэр, інакш, будучы за рулём, натуральна, пабачыў бы флікер і не дапусьціў бы аварыі. Напісаў? Расьпішыся.

І самае цікавае: тэма пагалоўнага пераходу на флікеры — скарб для апазыцыі. Вось тэма для прапаганды: усе беларусы носяць флікеры. І толькі адзін чалавек іх ніколі ня носіць: яны яму па лёгіцы непатрэбныя, таму што ён баіцца адзін выйсьці на вуліцу ня тое што ўначы, нават днём.

Дык ці беларус ён?

**Такая расьцяжка вісіць у Бешанковічах.**



## Памерла маці Генадзя Карпенкі

Маці вядомага палітыка, віцэ-сьпікера Вярхоўнага савету 13-га скліканьня Генадзя Карпенкі Веру Розум пахавалі побач з сынам і мужам. Спадарыня Вера пражыла 84 гады.

## Павялічаны памер замежнай дапамогі, якая не патрабуе рэгістрацыі

З 30 да 100 базавых велічыняў (Br3,5 млн) у месяц павялічаны памер бязвыплатнай замежнай дапамогі фізычным асобам, якая не патрабуе рэгістрацыі ў Дэпартамэнце па гуманітарнай дзейнасьці. Пры атрыманьні сродкаў у памеры больш як 100 базавых велічынь грошы трэба на працягу 5 дзён пералічыць на спэцыяльны дабрачынны рахунак і зьвярнуцца па рэгістрацыю дапамогі ў Дэпартамэнт. Скарыстацца сродкамі можна пасьля іх рэгістрацыі.

## Ад кадзіла загарэлася царква

Ад пажару пацярпеў Сьвята-Троіцкі храм у вёсцы Расна Дрыбінскага раёну. Пасьля суботняй дзённай службы прыхаджане разышліся, але праз пэўны час убачылі дым над дахам.

Прычынай пажару стала неасьцярожнасьць: вуглі з кадзіла выкінулі не ў мэталічнае вядро з вадой, а ў простую сьметніцу, дзе былі паперы. Царква знаходзіцца ў памяшканьні, якое праваслаўныя вернікі перарабілялі з крамы пяць гадоў.

## Жыхарка Менску крала грошы ў менскіх банкаў

Справа на падставе ч. 4 арт. 209 КК («Махлярства ў асабліва буйным памеры») распачатае папярэднім расьсьледаваньнем Маскоўскага РУУС Менску ў дачыненьні да мясцовай жыхаркі. Жанчына стварыла падабенства фінансавай піраміды. Пад выглядам атрыманьня крэдытаў на спажывецкія патрэбы, завалодала сродкамі шасьці банкаў. Ахвярамі махляркі сталі сем грамадзян, у якіх яна пазычала грошы. Агульная сума выкрадзенага перавышае 73 млн рублёў. Учыненьню злачынства садзейнічала тое, што служба бясьпекі канкрэтнага банку не магла мець зьвестак сваіх калег зь іншых банкаў.

## У Белавежы стварылі зубрыны статак для паляваньня

Дазвол на паляваньне на зубра тут каштуе 2—8 тысяч эўра. Суму вызначаюць характарыстыкі трафэю: даўжыня правага і левага рагоў, абхват рога ў аснове, велічыня капытоў і г. д. На замову кліента яму прадаюць яшчэ шкуру і галаву забітага зубра.

Паводле афіцыйнага падліку, у Белавескай пушчы на сёньня больш як 730 зуброў. Аднак многія эколягі лічаць гэтую лічбу завышанай.

## Барак Абама атрымаў Grammy

Кандыдат у прэзыдэнты ЗША Барак Абама стаў ляўрэатам музычнай прэміі Grammy ў намінацыі «Найлепшы аўдыёаповед». У гэтай катэгорыі спаборнічаюць гуказапісы прамоваў, выступаў, вершаў, а таксама аўдыёкнігі. Дыск Абамы «Адвага надзеі: развагі пра аднаўленьне амэрыканскай мары» быў прызнаны найлепшым. Канкурэнтамі ў барацьбе за Grammy былі Біл Клінтан і Джымі Картэр. Трыюмфатаркай цырымоніі стала брытанская сьпявачка Эмі Уайнхаўс. Яна перамагла ў пяці намінацыях.

## Згарэў галоўны помнік Паўднёвай Карэі

У Сэўле цалкам згарэла старажытная драўляная брама гораду: «Вялікія паўднёвыя вароты». Яны зь дзяцінства вядомыя кожнаму жыхару краіны і лічыліся яе галоўным нацыянальным скарбам. Пажар пачаўся ў нядзелю ўвечары. Каля 360 пажарнікаў спрабавалі перамагчы агонь, але брама абвалілася, і ад архітэктурнага помніка застаўся толькі каменны падмурак. Прычынай мог стаць падпал. «Вялікія паўднёвыя вароты» былі пабудаваныя 610 гадоў таму. Калісьці яны складалі частку муру, што атачаў стары горад, і служылі галоўным уваходам у старажытную карэйскую сталіцу. Каб адбудаваць браму, спатрэбіцца тры гады, кошт працы ацэньваецца ў 21 млн даляраў.

**Паводле радыё «Свабода», «Звязда», БелаПАН, радыё «Рацыя», BulletinOnline.org, BBC, Delfi.lt, newsru.com, ont.by**




**У Менску прайшоў адбор на конкурс прыгажосьці «Міс Беларусь 2008»**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ




**Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы.** Зборнік прозы




**Франц Сіўко. Дзень бубна.** Прыпавесьці, аповесьць




**Вясна народу:** Эсэістыка 1991—2007




**Віталь Тарас. Звыклае зло.** Зборнік эсэ.




**Застаемся!** Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае

Увага! Засталіся апошнія дзесяць асобнікаў!




**Сямён Печанко. У беларускім войску:** Падарунак прызыўніку.




**Бабілёнская бібліятэка:** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы».

Эдгар Алан По, О. Генры, Яраслаў Гашак, Бруна Шульц, Альбэр Камю, Хорхэ Люіс Борхэс ды іншыя — на роднай мове




**Алесь Кудрыцкі. Суд на Каляды.** Зборнік публіцыстыкі.




**Андрэй Хадановіч. Сто лі100ў на tut.by**

Увага! У продажы застаецца апошняя сотня асобнікаў!




**Андрэй Хадановіч. Бэр.** Новая кніга паэта, якога няма патрэбы прэзэнтаваць.




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна**

Кнігу склалі апавяданьні і дэтэктыўная аповесьць.




**Наталка Бабіна. Рыбін горад.** Раман




**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне




**Жанчыны выходзяць з-пад кантролю:** Беларускае жаночае апавяданьне.




**Найясьнейшая Рэч Паспалітая:** Цывілізацыя—Культура—Рэлігія—Палітыка—Авантура—Героіка—Успамін.




**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.** У сваіх мэмуарах, поўных важкіх дэталяў і трапных апісаньняў, пісьменьнік запрашае нас у прастору, дзе жылі Якуб Колас, Уладзімер Караткевіч, Васіль Быкаў, Яўгенія Янішчыц... Гэта ўнікальны летапіс быцьця душы, што праходзіць праз вайну і мір, жыцьцё і сьмерць, сяброўства і здраду, напісаны паўзьверх старонак гісторыі СССР, Эўропы, Беларусі...

У нядзелю, 24 лютага, на хвалях радыё Рацыя — чарговая праграма з цыклю «Жывая чытанка» — сумесны праект «НН» і радыё Рацыя. Аўтары кнігаў, выдадзеных у сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва», чытаюць у этэры свае творы.
Вядучы — Сяргей Будкін. Герой праграмы —Валянцін Тарас.
А 18.45 (па беларускім часе) «Жывую чытанку» адкрываюць «На высьпе ўспамінаў». Паўтор перадачы ўначы — а 0.45.
Рацыю можна пачуць на FM-хвалях 98,1 на Беласточчыне (Беласток, Гайнаўка, Саколка, Бельск-Падляскі…), а таксама он-лайн: http://racyja.com
Рацыю таксама можна паслухаць на ўсёй тэрыторыі Беларусі праз кароткія хвалі 5815 кГц (17.30 — 19.30).

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў




**Каляндар на 2008 год**

са здымкамі фатографаў «НН» Юліі Дарашкевіч і Андрэя Лянкевіча.

**Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца / Артур Клінаў. — Менск: Логвінаў, 2008. — 202 с. — («Кнігарня «Наша Ніва»)**







**Пётра Краўчанка. Беларусь на ростанях:** Нататкі дыплямата і палітыка




**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў.** Кніга падарожных эсэ.




**Павал Севярынец. Лісты зь лесу.** У кнзе сабраныя лісты, якія Павал Севярынец ад верасьня 2005 да ліпеня 2007 дасылаў у «Нашу Ніву» з Малога Сітна — месца сваёй высылкі.




**Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі**

сэрыя заснаваная ў гонар 100-годзьдзя «Нашай Нівы»

# Малюем разам з Танакам

Злучы кропачкі лініямі, пачынаючы ад лічбы 1!





Капітан Танака ©

http://www.tanakaland.org

## КАНЦЭРТЫ

### Крамбамбуля. Рамантычны канцэрт

**14 лютага а 19.00 у West World Club (вул.Старажоўская, 9)** выступіць «Крамбамбуля» з праграмай «Рамантычны канцэрт: Любімыя і новыя песьні». Квіткі: 25 000 (танцпляц), 50 000 (столік). Замова: (029) 505–73–15, (017) 293–17–98.

### Зьміцер Вайцюшкевіч

**17 лютага а 17-й у Віцебскай абласной філярмоніі** — канцэрт Зьмітра Вайцюшкевіча і WZ-Orkiestra. Квіткі: (0212) 36–21–03. Т.: (029)3 23–98–46, (029) 712–11–11

### Сольны канцэрт «Нэйра Дзюбэля»

**17 лютага ў клюбе «Гудвін» (пр. Незалежнасьці, 19)** — вялікі сольны канцэрт «Нэйра Дзюбэля». **Пачатак а 19-й.** Т.: (029) 671–58–65.

### Вясновая акцыя IQ48 і Zet

**24 лютага ў «Гудвіне»** гурты IQ48, Zet, s.d.m. запрашаюць на вялікую вясновую Friends' Party. Будзе неймаверны сюрпрыз! **Пачатак а 19-й.** Т.: (029) 254–49–09.

### Музычны вечар у Доме Ваньковічаў

**17 лютага ў Доме Ваньковічаў** у выкананьні Рамана Яраша прагучаць беларускія народныя і аўтарскія песьні на вершы паэтаў А.Разанава, У.Жылкі. Дапамогуць яму Андрэй Малаковіч (гітара), Іна Перасецкая (сьпевы, духавыя), Юлія Літвінава (сьпевы). **Пачатак а 15-й.**

### Дзень народзінаў Кабэйна

**22 лютага ў клюбе «Рэактар»** — дзень народзінаў Курта Кабэйна. Трыб'ют NIRVANA. **Пачатак а 18-й.** Т.: (029) 649–08–88.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Смутны беларускі блюз

**23 лютага ў малой залі к/з «Менск»** пройдзе **сольны канцэрт** вядомага гарадзенскага барда і актора **Віктара Шалкевіча** з прэзэнтацыяй дыскаў «Смутны беларускі блюз» і «Баляды і рамансы». **Пачатак а 19-й.** Квіткі: 12000—20000. Т.: (029) 766–24–25. Каса: 328–66–38

## РЭФЭРАТ

### Анатоль Сідарэвіч

**21 лютага** ў клюбе каталіцкай інтэлігенцыі імя сьв.Кірылы Тураўскага (вул.Арджанікідзэ, 6) — рэфэрат А.Сідарэвіча "Збаўленьне і вызваленьне: рэлігія і сацыялізм". **18.30.**

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**15 (пт)** — «Я не пакіну цябе»
**16 (сб)** — «Смак яблыка»
**17 (ндз)** — «Паўлінка»
**18 (пн)** — «Каханьне ў стылі барока»
**20 (ср), 21 (чц)** — «Чорная панна Нясьвіжа»
**22 (пт), 23 (сб)** — «Слуга двух гаспадароў»

*ранішія спэктаклі*

**17 (ндз)** — «Паўлінка»

*малая сцэна*

**15 (пт)** — «Варшаўская мэлёдыя»
**16 (сб)** — «Апэльсінавае віно»
**18 (пн)** — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях»
**20 (ср)** — «Востраў Сахалін»
**21 (чц)** — «Балада пра каханьне»

### Марцінкевіч-200

**19 лютага** паэтычны тэатар «Арт.С» у бібліятэцы імя Цёткі (вул.Талбухіна, 12а) прадстаўляе імпрэзу да 200-годзьдзя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча **«Ну й «Залёты» ў «Пінскай шляхты»**. З удзелам народных артыстак Беларусі Марыі Захарэвіч і Натальлі Гайды.

**Пачатак а 18-й.**

## ВЫСТАВЫ

### Сямейны партрэт

**PhotoGallery «Zнята» (пр. Незалежнасьці, 13)** ладзіць фотавыставу «Сямейны партрэт». Можна пабачыць сямейныя фота пачатку XX ст. Уваход вольны.

## КІНО

### Фэстываль кіно «Падарожжа Бэргмана на ўсход»

Фэстываль-рэтраспэтыва швэдзкага рэжысэра Інгмара Бэргмана «Падарожжа Бэргмана на ўсход», адбудзецца **ў Магілёве (кінатэатар «Радзіма»)** і **Менску (кінатэатар «Перамога»)**. Фільмы дэманструюцца зь перакладам на беларускую мову. **Сэансы без перакладу будуць толькі ў Менску з 25 па 29 лютага а 17-й.**

### Менск

**18 лютага, 19.00 — «Выспа Бэргмана»**, (Bergman Island), 2004, 84 хвілін, дакумэнтальны фільм, рэжысэр Мары Нірэрод.
**19 лютага, 19.00 — «Жанчыны ў чаканьні»** (Kvinnors väntan), 1952, 107 хвілін. Сэанс без перакладу — **26 лютага**.
**20 лютага, 19.00 — «Лета з Монікай»** (1953), 97 хвілін.
**21 лютага, 19.00 — «Мары»** (1955), 86 хвілін.
**22 лютага, 19.00 — «На краі жыцьця»** (1955), 85 хвілін.
**23 лютага, 19.00 — «Нічога ня кажучы пра жанчын»** (1964), 80 хвілін.
**24 лютага, 19.00 — «Шэпт і крыкі»** (1973), 91 хвіліна.
**25 лютага, 19.00 — «Восеньская саната»** (1978), 93 хвіліны.
**26 лютага, 10.00 — «Фані і Аляксандар»**, (1982), 188 хвілін.
**Пачатак а 19-й.**

### Магілёў

**15 лютага, 16.00 — «Мары».**
**15 лютага, 18.00 — «Лета з Монікай».**




**А 16 лютага а 20-й у Праскім Vagon'e (Narodni 25, palac Metro, Praha 1) — «Стары Ольса» і Ahmed ma hlad. Квіткі: 150kc. Т.: +420776234090**

# «Наўсікая з Даліны вятроў»

**Наўсікая з Даліны вятроў**
(Kaze no Tani no Nausicaa)
Японія, 1984, каляровы, 116 хв.
**Рэжысэр:** Хаяа Міядзакі
**Жанр:** Постапакаліптычная прыпавесьць, анімэ-казка для сямейнага прагляду
**Адзнака:** 8 (з 10)

Адзін зь першых фільмаў японскага чараўніка Хаяа Міядзакі, які стаў шырока вядомым пасьля анімэ «Зьнесеныя прывідамі». Само імя гераіні — Наўсікая — пазычана ім у Гамэра, а здольнасьці Наўсікаі разумець вусякоў узятыя зь японскай казкі. Экалягізм, прага гармоніі, характэрныя для японскай культуры — дасягаюць у творчасьці Міядзакі вяршыняў. Характары адрозьніваюцца дасканаласьцю й глыбінёй, малюнак агаломшвае.

У дзіўным сьвеце Міядзакі сьмелыя жанчыны — і неверагодныя жывёлы, пяшчотныя дый фіялетавыя колеры — і празрыстае неба, магія палёту — і любоў, якая ўсё выратоўвае і ўсё прабачае.

Карціна дэманструецца ў нядзелю ў кінатэатры «Дружба».

**Андрэй Расінскі**

# гІстарычНы сшытак «НН»

люты 2008




**Выбар генэрала.**
125 гадоў з дня народзінаў Станіслава Булак-Балаховіча. Піша Алег Дзярновіч ........ 19

**Апошні пазытывіст.**
Пра гісторыка Георгія Галенчанку, які давёў, што Скарына — не Георгій ........ 20

**Юры Сьлесарук: Калі ідзе дождж, мы закрываем раскоп плёнкай.**
Гутарка Наталкі Бабінай з загадчыкам унікальнага археалягічнага музэю «Берасьце» ........ 22

**Мір.**
Фотарэпартаж Ірыны Мірскай ........ 24


## ЗАПІСЫ

# На гэтым жыццё і дзержыцца...

* * *

Пыльны гарадзкі двор. Летняя сьпёка. Разьюшаная цётка скардзіцца знаёмай:

— Во гарачыня такая! А мне вокны не расчыніць праз мух і катоў. Суседзкая рабая котка такая падла! Ускочыць на вакно і сядзіць. Каб яна здохла разам са сваёй хазяйкай!

Расчыняецца вакно на другім паверсе. На ўвесь двор гаспадыня кліча свайго гадаванца:

— Мусік! Мусік!

Цёткі на лаўцы не застаюцца абыякавымі:

— Безабразьнічае ваш Мусік.

— Каб ён здох разам з... — асякаецца ахвяра каціната свавольства... — Разам з усімі!

— Хай бы і здох. Я ня праціў, — ласкава пагаджаецца гаспадыня Мусіка.

* * *

Іван ды Пятро, два браты сталага веку, паспрачаліся пра сучаснае жыцьцё.

**Іван:** Цяжка жыць. Толькі на ежу і хапае.

**Пятро:** На ўсё хапае — мой зяць машыну купіў.

**Іван:** Цяпер маладым, каб кватэру збудаваць, грошай не зьбярэш...

**Пятро:** А мой зяць збудаваў сабе кватэру...

**Іван са злосьцю:** У сраццы быў бы твой зяць, калі б на пахвальбу па блату ў міліцыю ня ўпёрлі!

**Пятро з гонарам:** Дык на гэтым жыццё і дзержыцца!

* * *

Сын выпіў лішняга. Пачаў чапляцца да аднавяскоўцаў. Атрымаў па смаркачах. Зваліўся на плот. Суседка са словамі «от, разумнага бацькі дзіця» пабегла скардзіцца да ягоных бацькоў.

Прыйшоў бацька, пачаў выхоўваць сына крыўднымі, але праўдзівымі словамі:

— Па пысе далі? Правільна зрабілі, ня лезь...

Да рэменю справа не дайшла. Сыну было каля пяцідзесяці, бацьку больш за восемдзесят.

**Сабрала Тацяна Барысік**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Віленская Судзебная Палата за забастоўку ў Менску на чугунцы ў 1905 г. асудзіла Жабу і Гамзагурдзі на 2 гады ў крэпасьць і Рэвэрэльлі — на 8 месяцаў. Другіх усіх апраўдалі — рабочага Альтшуля, каторы трымаў у сваёй кватэры бомбу, і яна разарвалась, прысудзілі на 4 гады ў катаргу; Прышынскага і Левітаса за трыманьне патайной друкарні сацыялістаў прыгаварылі ў крэпасьць на 2 г і 8 мес. кожнага.

**М.К. «Наша Ніва» № 6, 1908**





# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»**, проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### ДОМ

**Прадам** за 51 тыс. цагляны дом плошчай 100 кв.м.(зроблены на 70%) з участкам (6 сотак) каля Менску(1 км.). Ёсьць электрычнасьць, вада, падводзіцца газ. Т.: (029) 576–74–29

**Маладая беларускамоўная сям'я** зь дзіцём 6 гадоў здыме адносна таннае прыстойнае жытло ў Менску альбо пад Менскам (каб часта хадзілі электрацыя ці аўтобус). Разглядаюцца ЎСЕ варыянты. Т.:(029) 198–32–51

### ПРАЦА

**Якасна** выканаю пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17–й. Т.: (017) 245–18–72, (029)101–03–24. Юры

### ВАШ РОД

**Дапаможам** праверыць шляхетнасьць Вашага роду. Дашліце Вашае прозьвішча. alesknigi@mail.ru

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** 24 лютага (нядзеля) па маршруце: Менск—Белагруда—Вавёрка—Тарнава—Крупава—Дзікушкі—Малое Мажэйкава—Мураванка—Бердаўка—Менск. 14—17 сакавіка — «Падольскія Фартэцыі»: Камянец–Падольскі—Хоцін—Меджыбож. Т.: 292–54–58; (029) 622–57–20; (029) 509–12–16; (029) 110–19–28



**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф–рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.


12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 13.02.2008.

Замова № 840.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.